ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 7 (5013) 15 лютага 2019 г. ISSN 0024-4686

16 +

Гасцінна і па-гаспадарску стар. 6—7

Натхняльная пачуццёвасць стар. 8—9

Не гульня: фільмы «Летапісу» стар. 14

Час «К»

Так, дэвіз «Больш чым кнігі» дазволіў арганізатарам XXVI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу не толькі прапанаваць новыя выданні, але і прадставіць літаратуру ў яе складаным і шматаблічным працэсе, які назіраецца не толькі ў нашай краіне, але і наогул у свеце.

Пазнаёміцца з пісьменнікам асабіста, задаць пытанні, атрымаць аўтограф — калі ласка. Ці наведаць дыскусійныя пляцоўкі ды майстар-класы, флэшмобы і нават канцэрты, выкарыстаць магчымасці далучыцца да розных культур — праз розныя інтэрактыўныя формы. Пачуць, як гучыць слова ў тэатральнай прасторы, нават пабачыць літаратуру — праз кінаэкран, дзе дэманстраваліся фільмы паводле беларускіх пісьменнікаў, ды ўбачыць вялікую выстаўку мастакоў, якія плённа працуюць на глебе графікі (тэма, вартая асобнай гаворкі)... XXVI Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш — гэта пяць дзён, напоўненых рознымі падзеямі, фактычна вялікі форум, які прыцягнуў увагу больш чым 61 тысячы гасцей.

Найбольш яркія падзеі ды імгненні будзем адлюстроўваць у гэтым і наступных нумарах газеты.

Фота Кастуся Дробава.

Фота БелТА.

Старшыня журы М. Баразна ўручае Гран-пры за выданне «Вялікі гістарычны атлас Беларусі».

Мастацтва кнігі: на карысць краіны

Беларускія кнігавыдаўцы паспяхова завяршылі 2018 год: у конкурсе «Мастацтва кнігі» разглядалася 158 выданняў ад 40 арганізацый. Пасля адбору мастацка-экспертнай камісіі засталося крыху менш за палову кніг, якія ацэньвала журы пад старшынствам Міхаіла Баразны.

Працяг тэмы на стар. 4 ►

ISSN 0024-4686

акцэнты тыдня

Страта. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне родным і блізкім народнага артыста РСФСР Сяргея Юрскага. «Пайшоў з жыцця любімы многімі пакаленнямі таленавіты акцёр. Прыроджаная інтэлігентнасць, абаянне, прафесіяналізм і ўнікальная манера ігры дазволілі яму стварыць сотні запамінальных роляў, якія сталі прыкладам высокага мастацтва. Вобразы, увасобленыя ім у кіно і на тэатральных падмостках, нязменна пакаралі публіку псіхалагічнай дакладнасцю, глыбінёй і сілай характару», — гаворыцца ў спачуванні. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што на беларускай зямлі творчасць Сяргея Юрскага добра ведаюць і цэняць.

Перспектыва. XXIII Міжнародная спецыялізаваная выстаўка «СМІ ў Беларусі» адбудзецца з 2 да 4 мая ў адміністрацыйным комплексе па праспекце Пераможцаў, 14, паведамляе Міністэрства інфармацыі. Чакаецца ўдзел не менш за 100 экспанентаў ад 500 друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, тэле- і радыёпраграм і каналаў з Беларусі, Расіі, КНР, Балгарыі, Літвы, Азербайджана, Украіны, Латвіі, Індыі, Германіі, Турцыі ды іншых краін. Наведвальнікам будуць прапанаваныя прэзентацыі інфармацыйных і інтэрнэт-праектаў, аўтограф-сесіі, майстар-класы, флэш-акцыі. Кіраўнікі сродкаў масавай інфармацыі і журналісты, прадстаўнікі экспертнай супольнасці абмяркуюць надзённыя пытанні функцыянавання медыясферы, ролю СМІ ў развіцці грамадства і дзяржавы ў межах дзелавой праграмы выстаўкі.

Дата. Літаратурна-музычную кампазіцыю «Мяцеліца» прадставяць на сцэне Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы 6 сакавіка. Пастаноўка прымеркавана да 220-годдзя з дня нараджэння А. С. Пушкіна, якое будзе адзначацца 6 чэрвеня. Аповесць Пушкіна прачытае народны артыст Расіі Яўген Князеў пад аркестравую сюіту кампазітара Георгія Свірыдава, якую выканае сімфанічны аркестр БАТД пад кіраўніцтвам Аляксандра Сасноўскага. Музычныя ілюстрацыі прагучаць увечары 6 сакавіка ў вялікай зале тэатра. А 7 сакавіка Яўген Князеў прадставіць свой праект у Белдзяржфілармоніі ў суправаджэнні Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь.

Праект. Музей Беларускага Палесся прэзентуе сёлета праект «Таямніцы пінскай зямлі», прымеркаваны да акцыі «Пінск — культурная сталіца Беларусі». Паводле задумы, у музеі штоквартальна будуць экспанавацца скарбы, знойдзеныя падчас раскопак у рэгіёне. Усе экспанаты захоўваюцца ў фондах, публіцы іх прэзентуюць упершыню. Чакаецца, што першую калекцыю знаходак прадставяць у сакавіку. Музей Беларускага Палесся заснаваны ў 1924 годзе і з'яўляецца адным з найстарэйшых у краіне. Ён размешчаны ў гістарычным будынку былога езуіцкага калегіума — помніку архітэктуры XVII стагоддзя.

Прапанова. Школа сцэнарыстаў адкрываецца ў Гомелі. Адукацыйная праграма ўключае дзесяць заняткаў. У ролі выкладчыка — сцэнарыст вядомых праектаў і серыялаў («Кухня», «Даеш моладзь», «Анжаліка», «Дзякуй богу, ты прыйшоў», «6 кадраў») Алег Масціч, які распавядзе пра асновы прафесіі сцэнарыста, правілы распрацоўкі сюжэта і г. д. Для патэнцыяльных слухачоў узроставых альбо іншых абмежаванняў няма, галоўнае — жаданне асвоіць новую цікавую прафесію і творчы падыход да справы. Навучанне праводзіцца бясплатна. Арганізатар школы сцэнарыстаў — Гомельская гарадская арганізацыя БРСМ.

Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

супрацоўніцтва

Арменія — блізкая літаратурная старонка

У Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь прайшла рабочая сустрэча кіраўніка ведамства з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Арменія ў Рэспубліцы Беларусь Арменам Гевандзянам.

У час размовы міністра інфармацыі А. Карлюкевіча і спадара А. Гевандзяна былі закрануты многія пытанні медыйнага супрацоўніцтва паміж краінамі. Дасягнута дамоўленасць пра арганізацыю прэс-тура армянскіх журналістаў у пярэдадзень II Еўрапейскіх гульняў. У сваю чаргу і армянскі бок гатовы паказаць для беларускіх журналістаў турыстычны патэнцыял сваёй краіны.

Абмяркоўваліся і пытанні кнігавыдавецкага ўзаемадзеяння. Згадваўся досвед Выдавецкага дома «Звязда» па стварэнні бібліятэкі нацыянальных літаратур дзяржаў постсавецкай прасторы. Быў тады, у 2013 годзе, выдадзены і беларуска-армянскі том. Сярод аўтараў, якіх актыўна перакладаюць на беларускую мову, — і армянскі паэт, празаік Эдвард Мілітанян. Параўнальна нядаўна ў Мінску пабачыла свет яго кніга вершаў, адрасаваная дзіцячаму чытачу. Армен Гевандзян запэўніў, што ў будучыні беларуска-армянскія літаратурныя сувязі набудуць большую дынаміку, паабяцаў, што група армянскіх пісьменнікаў прыме ўдзел у святкаванні Дня беларускага пісьменства ў Слоніме ў верасні 2019 года.

Сяргей ШЫЧКО

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Каб напаўняць душу

Наспела неабходнасць стварэння Нацыянальнай праграмы па дзіцячым чытанні, дзе важна аб'яднаць магчымасці Саюза пісьменнікаў Беларусі з намаганнямі міністэрстваў — інфармацыі, адукацыі, сістэмай дзіцячых бібліятэк, іншымі зацікаўленымі арганізацыямі і асобамі. За гэтымі стараннямі — духоўнасць грамадства, яго ідэалы, а значыць, і будучыня краіны, лічыць дзіцячы пісьменнік, намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена Стэльмах.

Духоўнае выхаванне моладзі непарыўна звязана з кнігай. Уплыў інтэрнэту, тэлебачання на юную душу, а дакладней, насычэнне экранаў рознага кшталту жахамі, спалучанымі з жорсткасцю і насіллем, бязглуздыя сюжэты і агідныя героі, — усё гэта даўно турбуе пісьменніцкую супольнасць. Таму бум адчуваецца менавіта ў дзіцячай літаратуры. Ён праяўляецца як у колькасці новых імёнаў, так і ў аб'ёмах накладаў дзіцячай літаратуры, якія павялічваюцца. Напрыклад, у выдавецтве «Мастацкая літаратура» 40 працэнтаў асартыменту на год прыпадае менавіта на кнігі для дзяцей.

Пра тое, што гэтая праблема мае сусветнае значэнне, сведчаць рознага кшталту форумы пісьменнікаў, прысвечаныя важнасці дзіцячага чытання. У кожнай краіне задумваюцца над інтэлектам грамадства ў будучыні і звязваюць яго з кнігай як вечнай каштоўнасцю.

Фота Кастуся Дробава.

— У Беларусі дзіцячай кнізе і прапагандзе чытання ўдзяляецца ўсё больш увагі, выкарыстоўваюцца новыя формы далучэння дзяцей і падлеткаў да выхавання ўзаемапавагі, любові, сардэчнасці — усяго таго, што нясе сапраўдная кніга, — адзначае Алена Стэльмах. — Важны той факт, што ў нашай краіне дзіцячыя бібліятэкі падтрымліваюцца за кошт сродкаў мясцовага бюджэту. На набыццё новых кніг скіроўваецца 12 працэнтаў ад агульнай сумы, выдзеленай на фінансаванне бягучага ўтрымання бібліятэк.

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі секцыя дзіцячай літаратуры самая масавая. Актыўна працуюць яе старшыня паэт Уладзімір Мазго і самі пісьменнікі — Анатоль Зэкаў, Кацярына Хадасевіч-Лісавая, Вольга Нікольская, Генадзь Аўласенка, Мікола Чарняўскі, Мікола Маляўка. Аднак рэсурс магчымасцяў дзіцячых пісьменнікаў і іх таленавітых кніг, на думку Алены Стэльмах, выкарыстоўваецца не ў поўнай меры.

Марыя ЛІПЕНЬ

Мінскае гарадское аддзяленне СПБ запрашае:

15 лютага *— на сустрэчу з Віктарам Праўдзіным у гімназію № 4 (13.30).*

15 лютага *— на адборачны тур конкурсу чытальнікаў паэзіі Беларусі ў літаратурна-мемарыяльны музей Я. Коласа (15.00).*

15 лютага *— на сустрэчу з Аляксандрам Вашчанкам у межах тыдня роднай мовы ў СШ № 21 (13.30).*

16 лютага *— на сустрэчу з Таццянай Атрошанкай у межах тыдня роднай мовы ў гімназію № 19 (13.00).*

17 лютага *— на пасяджэнне літаратурнага аб'яднання «Акорд» пры дзіцячай бібліятэцы № 2 (15.00).*

18 лютага *— на сустрэчу з Леанідам Багдановічам у межах тыдня роднай мовы ў СШ № 77 (13.00).*

18 лютага *— у Школу юнага паэта пры гарадскім аддзяленні СПБ (14.00).*

19 лютага *— на прэзентацыю кнігі Міхася Пазнякова «Юнаму сябру» ў публічную бібліятэку № 21 (12.00).*

19 лютага *— на прэзентацыю кнігі перакладаў «Радка жывога пілігрымы» Іны Фраловай у Цэнтральную дзіцячую бібліятэку (13.30).*

20 лютага *— на паэтычна-музычнае свята з удзелам паэтаў аддзялення ў межах Дня роднай мовы ў музычны каледж імя М. І. Глінкі (15.35).*

21 лютага *— на сустрэчу з Вольгай Шпакевіч у межах тыдня роднай мовы ў публічную бібліятэку № 5 (13.00).*

21 лютага *— на сустрэчу з Міхасём Башлаковым у межах Дня роднай мовы ў гімназію № 61 (13.00).*

21 лютага *— на паэтычныя чытанні «Каласы роднай мовы» з удзелам пісьменнікаў у межах тыдня роднай мовы у публічную бібліятэку № 7 (15.00).*

22 лютага *— на сустрэчу з Анатолем Зэкавым у межах тыдня роднай мовы ў СШ № 26 (13.30).*

22 лютага *— на імпрэзу з удзелам паэтаў аддзялення ў тэатр «Літасфера» (вул. Някрасава, 3) (19.00).*

Брэсцкае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

20 лютага *— на сустрэчу з пісьменнікам, краязнаўцам, журналістам Анатолем Бензеруком у СШ № 9 г. Брэста (14.00).*

21 лютага *— на сустрэчу з брэсцкімі пісьменнікамі, прысвечаную Дню роднай мовы, у кніжную краму «Искра» (12.00).*

Віцебскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

21 лютага *— на сустрэчу «Святыя полацкай зямлі» з удзелам Пятра Буганава ў Полацкую бібліятэку імя Я. Купалы (17.00).*

Гродзенскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

15 лютага *— на заняткі «Пішам словы на мове» групы «Масмедыя г. Скідзеля» з удзелам Тамары Мазур у Скідзельскі дзіцячы дом сямейнага тыпу (17.30).*

16 лютага *— на ўрачыстасць з удзелам Пятра Сямінскага, прысвечаную 30-годдзю вываду савецкіх войскаў з Афганістана, у Гродзенскую пагранічную групу (11.00).*

16 лютага *— на заняткі школы маладога рэпарцёра з удзелам Ліны Багданавай у СШ № 12 г. Гродна (11.00).*

19 лютага *— на сустрэчу з Ганнай Скаржынскай-Савіцкай «Мова родная, гучы!» у СШ № 35 г. Гродна (12.00).*

20 лютага *— на тэатралізаваную літаратурна-музычную імпрэзу «Пагавары са мной па-беларуску», прысвечаную Дню роднай мовы, у Гродзенскую абласную навуковую бібліятэку імя Я. Ф. Карскага (16.00).*

20 лютага *— на гадзіну беларусазнаўства «Душа адгукнецца на роднае слова» з удзелам Ірыны Войткі і членаў Слонімскага раённага літаратурнага аб'яднання імя Анатоля Іверса ў Слонімскую цэнтральную раённую бібліятэку імя Якуба Коласа (14.00).*

21лютага *— на імпрэзу «Магутнае слова, ты, роднае слова», прысвечаную Дню роднай мовы, з удзелам літаратуразнаўцы Аліны Сабуць і паэтаў Людмілы Кебіч, Людмілы Шаўчэнкі і Антона Янкоўскага на філалагічны факультэт ГрДУ імя Янкі Купалы (13.00).*

21 лютага *— на гадзіну роднай мовы «Мова нашых продкаў згаснуць не павінна!» з удзелам Святланы Кошур у Карэліцкую раённую бібліятэку (14.30).*

22 лютага *— на сустрэчу з Людмілай Кебіч і Ганнай Скаржынскай-Савіцкай «Родная мова — усяму аснова» ў СШ № 33 г. Гродна (14.00).*

22 лютага *— на прэзентацыю літаратурнага альманаха «Альшанскі перазвон» № 2 з удзелам Браніслава Ермашкевіча, Пятра Сямінскага і Вікторыі Смолкі ў СШ № 39 г. Гродна (13.30).*

Магілёўскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

20 лютага *— на майстар-клас ад Міхаіла Уласенкі для вучняў СШ № 2 у Горацкі раённы гісторыка-этнаграфічны музей (11.00).*

20 лютага *— на адкрыццё конкурсу патрыятычнай песні і паэзіі «Радзіма, мая дарагая» з удзелам Уладзіміра Ясева і Наталлі Міхальчук у МДУ імя А. Куляшова (14.00).*

21 лютага *— на літаратурны марафон членаў СПБ «Жывое ў вяках беларускае слова», прысвечаны тыдню роднай мовы, у Магілёўскую абласную бібліятэку імя У. І. Леніна (11.00).*

22 лютага *— на краязнаўчыя чытанні «З любоўю да людзей і роднай зямлі», прысвечаныя тыдню роднай мовы, з удзелам Алеся Казекі ў бібліятэку-філіял № 9 (14.00).*

22 лютага *— на вечар памяці Івана Пехцерава, які праводзіць літаратурнае аб'яднанне «Натхненне», з удзелам Наталлі Міхальчук, Віктара Арцем'ева і Жанны Усцінавай у МДУ імя А. Куляшова (ауд. 353) (16.00).*

22 лютага *— на прэзентацыю новай кнігі Міколы Леўчанкі «Героі вызвалення» ў межах патрыятычнай акцыі «Героям найлепшая ўзнагарода, што ў кнігах памяць пра іх ёсць» у Быхаўскую цэнтральную раённую бібліятэку (14.00).*

набыткі

«ЁН ЗЯМЛІ ГЭТАЙ ЧАСЦІНКА...»

Імпрэза пад такою назваю, прысвечаная 95-годдзю пісьменніка, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнца і ганаровага грамадзяніна г. Жлобіна Аляксандра Капусціна адбылася ў Жлобінскім гарадскім цэнтры культуры. Падчас мерапрыемства дваццаты раз прайшлі Капусцінскія чытанні і была ўручана абласная літаратурная прэмія імя А. Капусціна, заснаваная Гомельскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі і Жлобінскім райвыканкамам. У сваёй творчасці Аляксандр Капусцін услаўляў родны кут. Усе яго творы прасякнуты любоўю да чалавека і малой радзімы.

Сёлета літаратурнай прэміі ўдастоена ветэран педагагічнай працы, паэтэса Марыя Смірнова, якая больш як сорак гадоў аддала школе, вучыла дзяцей рускай мове і літаратуры. Але ў сваёй дзейнасці актыўна карыстаецца і роднай мовай. Марыя Сямёнаўна — аўтар некалькіх паэтычных зборнікаў і слоў гімна Жлобіна, доўгі час узначальвала літаратурны клуб «Ліра» пры Цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Н. К. Крупскай. Творчую ўзнагароду і падарункі ёй уручылі старшыня Гомельскага абласнога аддзялення СПБ Уладзімір Гаўрыловіч і начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Жлобінскага райвыканкама Валянціна Няхай.

Падчас Капусцінскіх чытанняў Уладзімір Гаўрыловіч адзначыў, што шмат што з баявой біяграфіі Аляксандра Капусціна, які падчас вайны партызаніў, ваяваў з ворагам на фронце, знайшло ўвасабленне ў яго мастацкіх творах, напісаных ужо ў сталым узросце. Апавяданні «Бомба», «Два словы па-польску» і іншыя ўспрымаюцца сёння не толькі як мастацкія творы, але і як дакументы часу — своеасаблівыя падручнікі жыцця для сённяшняй моладзі. Памяць пра таленавітага творцу жыве: ладзяцца розныя імпрэзы, падчас якіх гучаць урыўкі з твораў Капусціна, а абласное аддзяленне заснавала спецыяльную літаратурную прэмію, якой раз у пяць гадоў адзначаюцца лепшыя сучасныя творцы вобласці і Беларусі.

Кіраўнік абласнога аддзялення СПБ прапанаваў больш актыўна далучаць да творчасці пісьменніка-франтавіка школьнікаў і моладзь Жлобіншчыны, заснаваўшы раённы літаратурны конкурс, і штогод у дзень памяці Аляксандра Капусціна адзначаць іх лепшыя творчыя набыткі.

Уладзімір Гаўрыловіч віншуе паэтэсу Марыю Смірнову, лаўрэата прэміі імя А. Капусціна.

Успамінамі пра Аляксандра Капусціна падзяліліся яго землякі. Завяршыла юбілейную ўрачыстасць літаратурна-музычная кампазіцыя, падрыхтаваная вучнямі школ Жлобіншчыны.

Дзяніс ІВАНОЎ

люстэрка тыдня

Японскі ордэн Узыходзячага Сонца сёння мяркуецца ўручыць народнай артыстцы Беларусі выкладчыку Беларускай дзяржаўнай харэаграфічнай гімназіі-каледжа Клары Малышавай, паведаміў на прэс-канферэнцыі часовы павераны ў справах Японіі ў Беларусі Хірокі Такунага. Гэтай узнагародай беларуска ўганаравана за вялікі ўнёсак у выхаванне японскіх артыстаў балета. Клара Малышава праводзіла майстар-класы ў балетных школах у розных гарадах Японіі. Японскім бокам таксама высока ацэнены яе ўнёсак у паглыбленне ўзаемаразумення паміж дзвюма краінамі ў цэлым. Клара Малышава стане першым кавалерам японскага ордэна сярод грамадзян Беларусі, паведаміла БелТА.

Легендарны супрацоўнік Імператарскай публічнай бібліятэкі Іван Крылоў (1769—1844) стаўся героем дзвюх выставак, якія адкрыліся ў гістарычным будынку Расійскай нацыянальнай бібліятэкі. Іх адкрыццё прымеркавана да 250-годдзя з дня нараджэння класіка айчыннай байкі, які калісьці працаваў тут на сціплай пасадзе бібліятэкара. Іван Андрэевіч быў спачатку памочнікам бібліятэкара, а ўжо потым — бібліятэкарам, які шмат зрабіў для фарміравання аддзялення рускіх кніг. «Мы прадстаўляем каталогі, над якімі ён працаваў, прэзентуем яго аўтографы. Наш фонд Крылова — адзін з самых вялікіх у Расіі і складае цяпер 60 адзінак захоўвання», — распавёў ТАСС супрацоўнік аддзела рукапісаў Леанід Сухарукаў, які і фарміраваў выстаўку, названую радком сучасніка Крылова — паэта Канстанціна Бацюшкава: «Поэт, лентяй, счастливец и тонкий философ».

У расійскі пракат выходзіць карціна расійскага рэжысёра Сяргея Дварцавога «Айка» пра маладую мігрантку, якая прыехала ў Маскву і была вымушаная пакінуць сваё дзіця ў радзільні, каб выжыць. Стужка патрапіла ў конкурс Канскага фестывалю ў 2018 годзе і прынесла выканаўцы галоўнай ролі Самал Яслямавай прыз за лепшую жаночую ролю. Фільм таксама трапіў у кароткі спіс намінантаў на прэмію «Оскар» ад Казахстана, інфармуе КАЗІНФАРМ.

Народная артыстка Расіі Ірына Мураўёва адзначыла 70-годдзе, паведамляе ТАСС. Яе дэбют у кіно адбыўся ў 1974 годзе ў фільме «Чыста англійскае забойства». Потым актрыса здымалася ў шматлікіх фільмах, але шырокую папулярнасць ёй прынесла легендарная стужка «Масква слязам не верыць» Уладзіміра Мяньшова, пасля якой Ірына Мураўёва была ўганараваная Дзяржаўнай прэміяй СССР. Затым Ірына Мураўёва знялася ў карціне «Карнавал», дзе не менш паспяхова выканала ролю правінцыялкі Ніны Саламацінай. Народная артыстка Расіі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР і Прэміі Урада Расіі, кавалер ордэнаў Знак Пашаны, Дружбы, Пашаны, «За заслугі перад Айчынай» IV ступені, Ірына Мураўёва жыве і працуе ў Маскве.

Заўтра ў Азербайджанскім дзяржаўным акадэмічным тэатры оперы і балета будзе паказаны сусветна вядомы балет Адольфа Адана «Жызель». Як паведаміла АЗЕРТАДЖ, галоўную ролю ў спектаклі выканае знакамітая прыма-балярына Нацыянальнай оперы Украіны, лаўрэат некалькіх міжнародных балетных конкурсаў, народная артыстка Украіны Таццяна Галякова. Яе партнёрам у спектаклі выступіць яшчэ адзін артыст украінскага балета, лаўрэат міжнародных конкурсаў Станіславаў Альшанскі, які выканае партыю графа Альберта. У ролі Мірты выступіць маладая салістка азербайджанскай трупы Аян Эйвазава. Дырыжор спектакля — Архан Гашымаў.

Агляд цікавінак ад Іны ЛАЗАРАВАЙ

не прамініце

«Вій»: містыка прачытання

У Беларусь вязуць найлепшы ўкраінскі спектакль

Рэдкі выпадак, калі ў нас ёсць магчымасць глядзець спектаклі з гэтай суседняй краіны. Але здарыцца такое 17 лютага, калі ў Палацы культуры прафсаюзаў адбудзецца паказ пастаноўкі «Вій. Докудрама» Чарнігаўскага акадэмічнага музычна-драматычнага тэатра імя Тараса Шаўчэнкі.

Назва пастаноўкі ўжо прыцягвае: калі сказаць проста «Вій», то адразу ўзнікаюць думкі пра Гогаля і яго герояў. Але сучасны ўкраінскі аўтар Наталля Варажбіт стварыла паводле класічнага сюжэта новы тэкст, дзе персанажы — нашы сучаснікі. Тое, як новы «Вій» быў увасоблены на сцэне, не засталося па-за ўвагай на радзіме. Рэжысёр Андрэй Бакір здабыў найвышэйшую тэатральную ўзнагароду Міністэрства культуры Украіны — Прэмію імя Леся Курбаса ў 2018 годзе. У 2018 годзе спектакль «Вій. Докудрама» стаў пераможцам I Усеўкраінскага тэатральнага фестывалю «ГРА» і быў удастоены Нацыянальнай тэатральнай прэміі ў намінацыі «Найлепшы драматычны спектакль».

Чаму? Каб зразумець, варта паглядзець. Ды яшчэ і таму, каб пабачыць, як у сучасным тэатры можна абыходзіцца з класічнымі сюжэтамі (ды тэкстамі). Таму што дзеянне ў спектаклі адбываецца ў Палтаўскай вобласці, куды адпраўляюцца два французскія студэнты да Аксаны, сваёй знаёмай па сетцы *Facebook*. Але... Аксана мёртвая, вяселле адмяняецца, участковы шукае вінаватага, а адзін з прыезджых французаў павінен адпяваць паненку на працягу трох начэй. Гэта сучасны спектакль, таму вынік абсалютна непрадказальны...

Мастацкі кіраўнік тэатра, рэжысёр-пастаноўшчык Андрэй Бакір стварыў спектакль пра пакаянне, дзе гістарычная памяць пра мінулыя беды можа хаваць адказы на пытанні, дзе шукаць надзею.

Акрамя таго, «Вій. Докудрама» — гэта адмысловае музычнае суправаджэнне, дэкарацыі з тэхнічнымі канструкцыямі і апантаны акцёрскі склад. Нездарма ж спектакль «найкращий».

Марыя АСІПЕНКА

віншуем!

З настаўніцкім крэатывам

Падведзены вынікі конкурсу газеты «ЛіМ» «Урокі сучаснасці» за 2018 год.

Галоўную прэмію атрымала **Таццяна Кандрашова** (сярэдняя школа № 178 г. Мінска імя Т. А. Лук'яновіча) — за плённае выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій і падрыхтоўку сумеснага з вучнямі праекта, які папулярызуе беларускую літаратару і разлічаны на шырокую аўдыторыю.

На другім месцы — метадычная распрацоўка «Незвычайныя формы ў сучаснай беларускай літаратуры» **Марты Багдановіч** (сярэдняя школа № 3 г. Ашмяны). Гэта работа адзначана за цікавую падачу матэрыялу і арыгінальную форму правядзення ўрока.

Трэцяе месца заняла работа **Таццяны Зямлянік** «Таямніцы сусветнага сеціва» (сярэдняя школа № 2 г. Турава). Значнасць гэтай распрацоўкі абумоўлена галоўнай мэтай заняткаў — навучанне дзяцей правілам бяспечных паводзін у інтэрнэце. Важны этап урока — актыўная камунікацыя паміж вучнямі сярэдніх і старшых класаў, непасрэдны абмен досведам на актуальную тэму.

Больш падрабязна пра вынікі — у найбліжэйшых нумарах.

ЛіМ КАЛЯНДАР

16 лютага 95 гадоў спаўняецца Андрэю Заспіцкаму, скульптару, заслужанаму дзеячу мастацтваў Рэспублікі Беларусь.

16 лютага — 90 гадоў з дня нараджэння Льва Гарэліка (1929—1996), скрыпача, педагога, народнага артыста БССР.

17 лютага — 70 гадоў з дня нараджэння Юрыя Якубовіча, майстра манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, скульптара.

18 лютага — 115 гадоў з дня нараджэння Мікалая Тэадаровіча (1904—1981), спевака, заслужанага артыста БССР.

18 лютага — 110 гадоў з дня нараджэння Вольгі Баравік (1909—1973), мастацтвазнаўцы.

18 лютага — 75 гадоў з дня нараджэння Яўгена Будзінаса (1944—2007), празаіка, нарысіста.

19 лютага — 155 гадоў з дня нараджэння Вячаслава (Вацлава) Адамовіча (псеўд. Дзяргач) (1864—1939), дзеяча беларускага нацыянальнага руху пачатку XX ст.

20 лютага — 95 гадоў з дня нараджэння Вячаслава Ражкова (1924—2002), мастака, майстра лакавай мініяцюры.

22 лютага — 130 гадоў з дня нараджэння Мікалая Байкова (псеўд. Крывіч Мікола) (1889—1941), літаратуразнаўца, лінгвіста, педагога.

22 лютага — 95 гадоў з дня нараджэння Аляксандры Нікіцінай (1924—1997), дзеяча самадзейнага мастацтва, хормайстра, заслужанага работніка культуры БССР.

Беларуская дзяржаўная філармонія

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады мастацкага кіраўніка Беларускага дзяржаўнага ансамбля народнай музыкі «Свята».

Кваліфікацыйныя патрабаванні: вышэйшая прафесійная адукацыя па напрамках адукацыі «Мастацтва музычнае», «Мастацтва сцэнічнае і экраннае» і стаж творчай работы не менш за 5 гадоў.

На працягу месяца з дня апублікавання аб'явы кандыдатуры будуць разгледжаны конкурснай камісіяй.

Для тлумачэння пытанняў, якія ўзнікнуць, звяртацца да мастацкага кіраўніка Белдзяржфілармоніі Ю. М. Гільдзюка па тэлефоне +375 17 331 55 56 ці да начальніка аддзела кадраў Ж. Г. Карачун — +375 17 284 43 17.

РЭКОРДЫ ІНТЭЛЕКТУАЛАЎ

(Неспартыўнае арыентаванне ў кніжнай прасторы з найлепшай колькасцю і найбольшай агульнай вагой набытых выданняў)

Фота Кастуся Дробава.

…Праехацца ад Палаца спорту да выставачнага павільёна «БелЭкспа» на паэтычным аўтобусе пад вершы і бардаўскія песні як маладых, так і ўжо вядомых беларускіх аўтараў з Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, сустрэцца і пагаварыць з любімым пісьменнікам з любой вобласці Беларусі непасрэдна на выстаўцы — усё было магчыма ў Мінску падчас міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. Ці ўзяць удзел у літаратурным квэсце або віктарыне па тым ці іншым творы; завітаць на шматлікія прэзентацыі кніжных навінак і, магчыма, адкрыць для сябе імёны новых цікавых літаратараў, ды, нарэшце, набыць — што немалаважна, па выдавецкім кошце, а ў апошні дзень работы выстаўкі і са зніжкамі — некалькі выданняў у хатнюю бібліятэку.

Прычыніцца да Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу сёлета было можна, нават не наведваючы выдавецкія экспазіцыі. Амаль паўтара дзясятка сталічных кавярняў, пабаў і рэстаранаў далучыліся да тэматычнага кніжнага гастрафэсту «Смак чытання», які быў зладжаны ўпершыню, і ўключылі ў меню страваы, згатаваныя сучаснымі кухарамі паводле літаратурных бестселераў розных краін. Асаблівай папулярнасцю ў наведвальнікаў карысталіся калдуны з мясам і грыбамі паводле Уладзіміра Караткевіча («Дзікае паляванне караля Стаха»), верашчака з блінамі, на якую кулінараў натхніла «Новая зямля» Якуба Коласа, апісаныя ў «Знесеных ветрам» Маргарэт Мітчэл грачаныя аладкі з кляновым сіропам, пірог «па-хобіцку» паводле Джона Рональда Руэла Толкіна і нават знойдзеная ў кнізе «Дракула» Брэма Стокера «папрыка Гендл». І калі да кошту гастранамічных вынаходак у гурманаў былі пытанні, то да смаку — адны кампліменты...

— Мама, глядзі, вось такая самая кніжка, як ты нам абяцала! — звініць патрабавальны галасок каля стэнда з дзіцячай літаратурай. Мінчанка Яўгенія Капыцька, якая вывучае асартымент разам з двума сынамі, задавальняе просьбу маленькіх кнігалюбаў і расказвае, што ўжо гадоў пяць не прапускае ніводнай кніжнай выстаўкі і ніколі не сыходзіць з пустымі рукамі: «Вось і сёння амаль на сто рублёў накупілі: дзіцячыя энцыклапедыі, некалькі перакладных мастацкіх кніг, прыгожае выданне Караткевіча, вучэбныя дапаможнікі... Каб набыць тое самае ў крамах, давялося б патраціць больш часу і грошай, а на Мінскай кніжнай выстаўцы заўжды хапае цікавых навінак».

— Сёлета выстаўка стала рэкорднай як па колькасці праведзеных у межах форуму мерапрыемстваў, так і па колькасці наведвальнікаў — больш чым 61 тысяча чалавек і прадстаўнікоў краін — удзельніц (іх 37), прычым упершыню прадставілі свае асобныя стэнды Азербайджан, Украіна, Казахстан, Ізраіль, Польшча, Грэцыя і Кітай. У рабоце Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу узяў удзел 441 экспанент, з іх 164 замежныя, — рэзюмаваў старшыня Савета кніжных выставак і кірмашоў, што ладзяцца ў дзяржавах — удзельніцах СНД, генеральны дырэктар выдавецкага і кнігагандлёвага ТАА «Макбел» Дзмітрый Макараў. Дыпломы арганізатараў атрымалі, дарэчы, выдавецтва «Аверсэв» — за найлепшую тэматычную экспазіцыю, а таксама Паліграфічны камбінат імя Якуба Коласа.

Але выстаўка-кірмаш кніг — гэта ўсё ж не спаборніцтва, хто больш і ярчэй, таму што кнігі бываюць розныя. Чым больш разнастайны выбар, тым лепш задавольваюцца патрэбы людзей у тых ці іншых ведах ці глебе для роздуму. Намеснік міністра інфармацыі Беларусі Ігар Бузоўскі адзначыў, што межы выставачнага павільёна ўжо відавочна сталі цесныя для такога маштабнага форуму, а таму цалкам правільна, што ён праходзіў сёлета на розных пляцоўках:

— Усе гэтыя творчыя сустрэчы, насычаныя і цікавыя дыскусіі, я спадзяюся, паслужаць таму, каб наша наступная выстаўка была яшчэ больш маштабная і напоўненая разнастайнымі мерапрыемствамі.

Выстаўка скончылася, але кнігі засталіся, іх, упадабаных і жаданых, трэба будзе шукаць цяпер у кнігарнях, якіх у Мінску ужо стала больш: добрая справа — у выставачныя дні адкрываць кніжную краму «Дружба», куды заўсёды можна завітаць на працягу года.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

Фота Таццяны Ткачовай.

На цырымонію ўрачыстага адкрыцця кнігарні «Дружба» завітаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Германіі ў Беларусі Петэр Дэтмар.

«Мастацтва кнігі»: на карысць краіны

Падвядзенне вынікаў нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі», што адбываецца ў межах Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, сёлета праходзіла ў Палацы мастацтваў, дзе экспануецца выстаўка беларускіх графікаў (пра якую мы распавядзём у наступным нумары). Пераможцы былі вызначаны ў чатырнаццаці намінацыях.

Перш чым былі агучаны вынікі, намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігар Бузоўскі адзначыў, што кніга — найважнейшая каштоўнасць грамадства, якую трэба развіваць і прасоўваць ва ўмовах рэальнага часу, таму што кніга абрастае новымі задачамі. Яна павінна быць цікавая, запатрабаваная, карысная для грамадства, для асобнага чытача і для краіны. Менавіта таму патрабаванні да намінантаў былі вельмі высокія.

Найвышэйшая ўзнагарода ў намінацыі «Трыумф» прысуджана 4-томнаму выданню **«Вялікі гістарычны атлас Беларусі»** рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белкартаграфія» Дзяржаўнага камітэта па маёмасці.

У намінацыі «ЛІТ-фармат» ганаровы знак-сімвал «Залаты фаліянт» і дыплом пераможцы прысуджаны выдавецтву «Мастацкая літаратура» за кнігу Алеся Разанава **«Такая і гэтакі: талакуе з маланкай дождж»**, а таксама дыплом першай ступені за кнігу **«Пялёсткі лотаса і хрызантэмы: Сто паэтаў Кітая XX стагоддзя»**. Выдавецтва «Беларусь» адзначана дыпломам II ступені за выпуск кнігі Адама Міцкевіча **«Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве»**.

Кнігі для юных чытачоў прадстаўлены ў намінацыі «Разам з кнігай мы расцём», у якой пераможцам стала **«Залатая шарсцінка, срэбная павуцінка»** выдавецтва «Медыял». Дыпломы першай ступені прысуджаны выдавецтву Свята-Елісавецінскага жаночага манастыра Мінска за кнігу **«Прыгоды сямейнага ката Гусарыка»** Таццяны Дашкевіч і выдавецтву «Альтыора Фортэ» за кнігу Мішэля Рэнэры **«Хто ёсць хто»**. Выдавецтва «Мастацкая літаратура» ўзнагароджана дыпломам другой ступені за кнігу Валянціны Паліканінай **«Ні да чаго быць аднаму»**.

У намінацыю «Эўрыка» ўвайшлі навуковыя і навукова-папулярныя выданні. Найлепшай стала кніга **«У рытме гадоў, што ляцяць... Нарысы гісторыі камсамола Беларусі»** выдавецкага дома «Звязда». Дыпломы першай ступені атрымалі навукова-папулярнае выданне **«Беларусь: шлях у космас»** і **«Беларусь — Літва: час збліжэння»** Уладзіміра Дражына (ТДА «Бяловагруп»).

Падчас віншавання пераможцаў намінацыі «Эўрыка» дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі адзначыў, што конкурс «Мастацтва кнігі» з кожным годам усё больш матывуе ўдзельнікаў на работу з сур'ёзнай літаратурай.

У намінацыі «Духоўнасць» дыплом пераможцы ўручылі выдавецкаму дому «Беларуская навука» за кнігу Вольгі Лабачэўскай **«Мастацтва дзеля славы Божай: саламяныя іканастасныя вароты і царкоўна-культавыя прадметы»**. Але адзначылі выданне **«Святло Полацкай зямлі: жыццё прападобнай Ефрасінні вачыма дзяцей»** (Спаса-Ефрасіннеўскі стаўрапігіяльны жаночы манастыр Полацка), а таксама кнігі **«Мы не можам жыць як усе. Протаіерэй Андрэй Лемяшонак»** і «Блізкія Богу і людзям» (Свята-Елісавецінскі жаночы манастыр Мінска).

У намінацыі «Залатыя скрыжалі» ацэньваліся даведачныя і энцыклапедычныя выданні. «Залаты фаліянт» і дыплом пераможцы ўручылі выдавецтву «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» за падрыхтоўку і выданне трохтомнай энцыклапедыі **«Янка Купала»**. Дыплом першай ступені атрымала кніга-альбом **«Музеі Беларусі»** таго ж выдавецтва. Дыплом другой ступені прысуджаны выдавецтву «Беларусь» за кнігу Барыса Лазукі **«У засені замкаў і палацаў: матэрыяльная культура сацыяльнай эліты Беларусі XII — пачатку XX стагоддзя»**.

Пераможцамі і ўладальнікамі дыплома I ступені ў намінацыі «АРТ-кніга» сталі выданні Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў: **«Веліч і слава Магілёўшчыны. Слава Беларусі і Расіі»** Ігара Марзалюка і альбом **«Шэдэўры карпаратыўнай калекцыі Белгазпрамбанка»**. Дыпломам II ступені ўзнагародзілі літаратурна-мастацкае выданне **«Удасканальвайся. Дасканаласць»** Паўла Семчанкі выдавецтва «Мастацкая літаратура» і альбом **«Васіль Шаранговіч»** выдавецтва «Беларусь».

— Новай традыцыяй, якую сфарміраваў конкурс «Мастацтва кнігі», з'яўляецца прадстаўленне ўнікальных выданняў, выраблены у адзінкавых асобніках з сапраўднымі афортамі, гравюрамі, з тэкстам, набраным уручную, — падкрэсліў падчас віншавання пераможцаў намінацыі «АРТ-кніга» старшыня журы Міхаіл Баразна. — Я на гэты працэс гляджу як на сапраўднае мастацтва, якое нельга не заўважаць. Тым больш яно яднае ў сабе як творчую, так і літаратурную частку. Ад гэтага каштоўнасць узрастае.

А ў намінацыі «Фотапогляд» перамогу атрымаў фотаальбом **«Беларусь. Пасланне міру»** (ТДА «Беловагруп»), дыпломамі адзначаны фотаальбомы **«Нясвіж. Палацава-паркавы ансамбль. Сады і паркі»** ў серыі «Нясвіж. Палацава-паркавы ансамбль» выдаўца Аляксандра Аляксеева і **«Бачу Беларусь такой. *I am seeing Belarus like that*»** Уладзіміра Цыдзіка (Выдавецкі дом «Звязда»), **«Імгненні стагоддзя. 1918—2018»** (УП «БелТА»).

Адна са спецыяльных намінацый конкурсу, што падвёў кніжныя вынікі Года малой радзімы, называлася «Сцяжынкамі роднага краю». Пераможцам вызначаны зборнік **«Зямля бацькоў, святая...»**, які выйшаў у серыі «100 вершаў» выдавецтва «Мастацкая літаратура». Уладальнікамі дыпломаў сталі навукова-папулярныя выданні Артура Зельскага **«Хатынь. Трагедыя беларускага народа»**, Наталлі Яцкевіч і Міхаіла Нікіціна **«Трасцянец. Трагедыя народаў Еўропы»** («Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі»), краязнаўчыя выданні **«Лошніца»** і **«Забашавічы»** (ТДА «Чатыры чвэрці»).

У персанальнай намінацыі «Майстэрства» адзначаюцца асобы. Найлепшым ілюстратарам кнігі прызнаны Вячаслаў Валынец за **«Казкі для гарэз»** (ААТ «Харвест»), лепшым фатографам — **Міхась Раманюк** за ўклад у беларускую нацыянальную мастацкую фотакультуру, лепшым дызайнерам стаў Міхал Анемпадыстаў за ідэю, аўтарскую канцэпцыю, тэкст і мастацка-графічнае выкананне выдання **«Колер Беларусі»**.

Ёсць за кім цягнуцца, ёсць дзеля чаго працаваць далей.

Вікторыя АСКЕРА

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

Як гучыць слова

Пытанні міжкультурнага супрацоўніцтва, узаемнага ўзбагачэння, сапраўдных каштоўнасцяў і пошукаў шляхоў да чытача традыцыйныя для сустрэч пісьменнікаў з розных краін. Міжнародны сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час», які праходзіў ужо пяты раз падчас Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, даў магчымасць паразважаць яшчэ і пра важнае, але складанае становішча пісьменніка ў сучасным свеце. З думкамі некаторых удзельнікаў мы пазнаёмілі ў папярэдніх нумарах.

У сімпозіуме ўдзел узялі пісьменнікі, крытыкі і перакладчыкі з Азербайджана, Вялікабрытаніі, Венгрыі, Германіі, Італіі, Казахстана, Латвіі, Літвы, Малдовы, Расіі, Славакіі, Злучаных Штатаў Амерыкі, Таджыкістана, Узбекістана, Украіны і Францыі. Меркаванні аказаліся розныя, а мы прыводзім самыя цікавыя. Ахвотных выступіць было так шмат, што праблемы і перспектывы літаратуры абмяркоўваліся таксама і падчас многіх імпрэз сёлетняй выстаўкі.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ, міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь:

— Традыцыя нашага сімпозіума, які праводзіцца пры такіх заснавальніках, як Міністэрства інфармацыі, Саюз пісьменнікаў, Выдавецкі дом «Звязда», выдавецтва «Мастацкая літартура», вырасла з тых круглых сталоў, якія праходзяць у межах Дня беларускага пісьменства ў верасні. Калі мы задумваліся пра мэты такіх сустрэч, якія праходзяць з 2015 года, то спадзяваліся, што ўсе праекты — круглы стол, сімпозіум «Пісьменнік і час» — стануць добрай пляцоўкай міралюбівых добрасуседскіх адносін у гуманітарнай сферы, у галіне культуры, літаратуры і мастацтва. Спадзяваліся, што абедзве пляцоўкі дапамогуць аб'яднацца розным перакладчыкам, пасадзейнічаюць, каб беларускую літаратуру шырэй прадстаўлялі ў свеце, дапамогуць перайсці ад размоў аб раз'яднанасці да спраў, якія прывядуць да кансалідацыі і асэнсавання таго, што мы павінны быць разам. А нашым памочнікам у дасягненні добрых намераў павінна быць мастацкае слова.

Мікалай ЧАРГІНЕЦ, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі:

— У мяне ўзнікла ідэя: а што, калі б з'явілася Сусветная асацыяцыя пісьменнікаў, куды б уваходзілі прадстаўнікі ўсіх дзяржаў і ўсе б яны выпрацоўвалі сваю палітыку, нягледзячы на палітыку асобных краін? А гэта палітыка зводзілася б да аднаго — што могуць зрабіць пісьменнікі для таго, каб усталяваўся мір, каб стала менш пазбаўленых права пражываць на нейкай тэрыторыі, прымушаючы іх мігграваць. Што можа зрабіць творца, каб найбольш моцныя дзяржавы свае сродкі, якія трацяць на ўзбраенне, хаця б часткова трацілі на ўратаванне цэлага насельніцтва той ці іншай краіны ад голаду ці ад надыходзячай катастрофы, такой як недахоп вады? Гэта было б прапаведаванне раўнапраўя, сяброўства і супрацоўніцтва паміж усімі народамі. А мы, у сваю чаргу, адкрыты для сяброўства, гатовы сустракацца, у тым ліку на рэгіянальным узроўні, абменьвацца творамі і ўзбагачаць літаратуры.

Кенжахан МАТЫЖАНАЎ, дырэктар Інстытута літаратуры і мастацтва імя М. Аўэзава Міністэрства навукі і адукацыі Рэспублікі Казахстан:

Фота Кастуся Дробава.

— У трывожным і неспакойным XXI стагоддзі слова пісьменніка гучыць як заклік да міру. Нацыянальная літаратура ўплывае на міжнародны імідж дзяржавы, робячы яго прывабным для пашырэння інтэграцыйных працэсаў і кантактаў. 2019 год аб'яўлены ў краінах СНД Годам кнігі. Старт усім мерапрыемствам дала Беларусь, абазначыўшы кірункі далейшага літаратурнага і культурнага супрацоўніцтва.

Чытаючы літаратуру іншай краіны, мы лепш разумеем яе народ. Сучасная літаратура патрабуе ад чытача актывізацыі асацыятыўнага мыслення, сутворчасці і эрудыцыі. Узбагачэнне нацыянальных літаратур ідзе праз мастацкі пераклад, актуальнасць і значнасць якога ўзрастае. Напрыклад, у Казахстане паспяхова рэалізоўваецца праграма, ініцыяваная Прэзідэнтам Нурсултанам Назарбаевым у межах праекта па перакладзе лепшых твораў мастацкай літаратуры на шэсць моў народаў свету. А мне хацелася б прапанаваць ідэю аб стварэнні Міжнароднай асацыяцыі параўнальных даследаванняў, якая можа стаць своеасаблівым навуковым цэнтрам па вывучэнні нацыянальных культур і літаратур, форм і заканамернасцяў міжлітаратурнага працэсу і дыялогу культур як аб'ектаў супастаўляльнага літаратуразнаўства.

Мар'ян СЕРВАТКА, пісьменнік, публіцыст, перакладчык (Славакія):

— Што значыць сур'ёзны пераклад? Ён можа мець уплыў пазітыўны і негатыўны. Я ўспамінаю жарт пра тое, што такое паэзія. Кажуць, што паэзія — гэта тое, што губляецца пры перакладзе. Гэта не заўсёды праўда. На пачатку культуры заўсёды было слова. Пачынаючы ад Святога Пісання. Аднак у пачатку славацкай культуры быў пераклад слова. Вось чаму ён настолькі важны.

Ужо даўно створаны дыялог культур «Беларусь — Славакія», асабіста я займаўся перакладамі твораў Янкі Купалы. Паэзія — гэта толькі адзін добры мост, які з дапамогай перакладаў збліжае народы. Саюз пісьменнікаў усяго свету стаў бы добрай ініцыятывай у гэтым.

Гафрэда МУРАТДЖА, паэт (Італія):

— Я ўжо паўтара года жыву ў Беларусі, таму пра сучасны італьянскі літаратурны працэс ведаю не так шмат. Хачу адзначыць, што такое паняцце, як гасціннасць, тут прысутнічае ў вельмі значнай меры — сустракаю яго ў душах усіх беларусаў. Таму, калі вярнуся на радзіму, будзе вельмі цікава паглядзець, што ў Італіі ведаюць пра беларускую літаратуру. Думаю, што стымулам да гэтага паслужыць і цікавы досвед удзелу ў міжнародным сімпозіуме літаратараў. Дарэчы, згадаўшы пра гасціннасць, адразу задумаўся пра агульную канцэпцыю паняцця «пісьменнік і час». Я хачу крыху сказаць пра адносіны пісьменніка і часу ў Італіі. У нашай краіне даволі востра абмяркоўваецца, наколькі пісьменнік абавязаны быць прадстаўніком свайго часу з палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага, маральнага пунктаў гледжання. Пачынаючы ад Вергілія і да аўтараў нашага часу, заўсёды задавалася пытанне: наколькі пісьменнік павінен быць удзельнікам сучасных яму падзей? Не так даўно выйшлі два вялікія артыкулы вядомага італьянскага літаратуразнаўцы Сабіяна Веранэзі, якія акурат заклікалі пісьменнікаў выступіць фронтам вакол актуальнай для Італіі праблемы іміграцыі, бо краіна закрыла свае парты. Але і тут не ўсё адназначна.

Некаторыя наіўна лічаць, што быць недасведчаным — гэта значыць вярнуцца да сваіх вытокаў і стаць бліжэйшым да прыроды. І, што мяне вельмі хвалюе, у маёй краіне, у Еўропе і ва ўсім свеце такая неадукаванасць праслаўляецца. І я спадзяюся зразумець, як з гэтым справы ў Беларусі. Па маіх назіраннях, тут такой з'явы няма. Наадварот, ёсць адчуванне сакральнасці культуры.

Аляксандр КАЗІНЦАЎ, першы намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Наш современник», публіцыст і літаратурны крытык:

— Кожны год сёмы нумар нашага часопіса мы прысвячаем Беларусі. Але з кожным годам наша праца па яго выданні становіцца ўсё больш складаная. Справа ў бядотным становішчы часопісаў. Раней мы казалі, што часопісы знахо-дзяцца на мяжы выжывання. Але мяжа, здаецца, пяройдзена: прыпынілі сваю работу часопіс «Октябрь» з велічэзнай гісторыяй, «Ореон» таксама зачыніўся. У чым справа? Праблема ў няўвазе ўлады, у яе недасведчанасці. Я памятаю губернатараў, якія любілі і кнігу, і часопісы, і пісьменнікаў, запрашалі іх і да сябе. Цяпер сітуацыя крыху іншая. Але колькі раз у Расіі літаратура выжывала незалежна ад улады? А іншы раз і ў супрацьстаянні з уладай? Яна жыла за кошт любові чытача. Цяпер чытач аддаляецца ад кнігі. Я б не стаў гаварыць пра віну рускага народа, мы зашмат кажам пра яго віну. Віна канкрэтнага сучаснага чалавека, больш за тое, хутчэй, не віна, а бяда. Нядаўна, выступаючы на Гайдараўскім форуме, вядомы сацыяпсіхолаг Таццяна Чарнігаўская назвала прадстаўніка нашага часу «чалавекам разгубленым». І, як часта бывае з разгубленым чалавекам, ён яшчэ і раззлаваны. І, як часта бывае раззлаваным чалавекам, ён зрываецца на таго, хто бліжэйшы і раднейшы за ўсіх. А хто бліжэйшы і раднейшы ўсім простым людзям? Вядома, пісьменнікі. І гэты разгублены раззлаваны чалавек кажа: «Я не буду слухаць таго, што вы мне кажаце! Гэта добра, гэта дрэнна! Гэты чытаць, а гэта не чытаць! Я сам вызначуся! Я не буду цярпець вашага "дыктату"!» І нясвяцны чытач трапляе пад цалкам рэальны дыктат ад нейкіх прайдзісветаў, якія назвяваюць яму свае ўяўленні.

Спадзяюся, што з'явіцца новы вялікі пісьменнік: руская літаратура багатая на таленты. Але трэба стварыць нейкія ўмовы для таго, каб яго чыталі. Бо калі вартыя пісьменнікі, якія друкуюцца ў часопісе «Наш современник», страцяць гэтую апору, баюся, яны не стануць пісьменнікамі, вядомымі ўсёй Расіі. Няма сэнсу даказваць эстэтычнае значэнне пісьменніка. Але варта казаць і аб практычным значэнні творцы. Успомніць хаця б ідэю павароту паўночных рэк, якая была гатова разбурыць Цэнтральную Расію. Пісьменнікі першыя выступілі супраць. Толькі потым іх падтрымалі вучоныя, усе яны не далі ажыццявіць гэтую вар'яцкую ідэю. Ці ўзяць эсэ В. Шукшына «Что с нами происходит?», якое аказала вялізны ўплыў на ўсю краіну. Але цяпер няма пісьменніцкага аўтарытэту ў свеце. Калі б чыталі беларускіх пісьменнікаў, то ведалі б пра тое, як яны змагаліся за сваю незалежнасць у Вялікую Айчынную вайну, і хіба наогул узнікла б абсурдная ідэя, каб Беларусь увайшла ў склад Расіі? Пісьменнікі патрэбны нават для такіх практычных, але кардынальных спраў.

***

Заўсёды цікава даведацца, на што скіроўваюць свае погляды сучасныя пісьменнікі з розных куткоў свету. Цяпер творцы б'юць трывогу, нягледзячы на тое, што творы публікуюцца, кнігі выходзяць, іх набываюць. Падаецца разумным пісьменніку ўсё ж часцей звяртацца да чытача не толькі шляхам публікавання кніг. Вялікая верагоднасць, што ён застанецца проста непачутым у плыні твораў і імёнаў. Ды і чытач, які не адвярнуўся ад сучаснай кнігі, хоча адчуць жывы голас, які заклікае, адстойвае і абвяшчае... Як відаць з гісторыі, пісьменнікі мелі аўтарытэт, да іх прыслухоўваліся, яны ўплывалі на свет часам кардынальна. Некалі свой шлях, які стаў непарушным на доўгія стагоддзі, абраў Віктор Гюго. У рэшце рэшт, якім чынам весці размову з чытачом сёння, як прываблівіць да мастацкага слова, па якой дарозе ў творчых пошуках пайсці, выбірае сам творца.

Яўгенія ШЫЦЬКА

ЦЭНТРАЛЬНЫ ПУНКТ

Фота Кастуся Дробава.

Крэслы каля кампактнай сцэны, што арганізавалі на нацыянальным стэндзе Расійскай Федэрацыі, увесь час імкнуліся заняць наведнікі: цэнтральны экспанент. Тут імпрэзы змянялі адна адну. Ідзеш міма — прыслухаешся. Затрымаешся.

Як жа не затрымацца, калі раптам з расійскага стэнда даносіцца спеў беларускай «Купалінкі»? Яе спяваў разам з беларусамі Яўген Вадалазкін, пісьменнік з Санкт-Пецярбурга. У Мінку ён прадставіў сваю новую кнігу «Брысбэн», што само па сабе прыцягнула ўвагу, а тут яшчэ і такія спевы…

Ці няўжо ж можна было прайсці міма, калі бачыш, што на стэндзе «Кнігі Расіі» чытае вершы наш паэт Алесь Разанаў? А такое было, і не толькі яго з беларускіх пісьменнікаў ды творцаў з іншых краін запрашалі калегі з суседняй краіны. Паэтычны канцэрт з удзелам музыкаў і паэтаў, якія пішуць на славянскіх мовах, арганізаваны Міжнародным агенцтвам гуманітарных ініцыятыў «Са стагоддзя ў стагоддзе», быў цікавы: няма праблем у нашай аўдыторыі з разуменнем (ці адчуваннем) гэтых самых моў.

Да расійскіх удзельнікаў, якіх таксама прыехала шмат, стаялі чэргі па аўтографы. Некаторыя мэтанакіравана ішлі «на Рэзніка». Вядомы паэт-песеннік Ілья Рэзнік прадстаўляў дзіцячую кнігу «Цяпа не хоча быць клоўнам». І калі такую зорку сустрэнеш яшчэ? Ды і Вераніку Доліну імкнуліся не прапусціць тыя, хто любіць яе песні і вершы: канцэрт у Доме Масквы прайшоў з аншлагам. Але чарга стаяла па аўтографы і да Мікалая Далгаполава: папулярныя яго кнігі з серыі «ЖЗЛ».

Адметнасць вялікіх кніжных выставак з вялікім міжнародным удзелам у тым, што імкнуцца ўлічыць розныя аўдыторыі чытачоў і асаблівасць самой краіны. У Беларусь расіяне сёлета ехалі ў большасці ўсё ж з сур'ёзнымі тэмамі: як трансфармуецца літаратура; чаму так плённа развіваецца нон-фікшн і як трэба пісаць для дзяцей, каб яны захацелі чытаць. У якасці экспертаў па «дзіцячай» тэме выступілі нашы аўтары Яўгенія Пастарнак і Андрэй Жвалеўскі, чые кнігі сталі бестселерамі ў Расіі і Беларусі.

Выстаўка — таксама добрая пляцоўка для дамоў пра далейшае супрацоўніцтва ў галіне кнігавыдання. Напрыклад, прадстаўнікі расійскага выдавецтва «Маладая гвардыя», якое пасля заключэння прамога дагавора з «Белкнігай» атрымала магчымасць рэалізаваць у нашай краіне свае выданні, наўпрост адзначылі высокую цікавасць да сваіх кніг і аўтараў, а таксама былі прыемна ўражаныя некаторымі беларускімі выдавецкімі праектамі і нагледзелі для сябе ў нас новых патэнцыяльных аўтараў. Некаторыя расійскія выдавецтвы ўжо даўно выдаюць у Расіі беларускіх пісьменнікаў, як, напрыклад, «Час», для якога гэта прынцыповае пытанне. Таму сёлета не варта было дзівіцца таму, што каля расійскага стэнда можна было ўбачыць і Віктара Марціновіча, і Альгерда Бахарэвіча, па аўтографы да Святланы Алексіевіч стаяла чарга. І наведнікі заходзілі, каб паглядзець і набыць кнігі — некаторыя адмыслова загадзя адкладалі грошы на кнігі, якія прадаваліся тут з істотнымі зніжкамі.

Наогул, на стэндзе Расійскай Федэрацыі ўрад Масквы прадставіў больш як 500 найменняў кніг.

Марыя АСІПЕНКА

Сяброўства як нагода для гонару

Як павінны ўзаемаўзбагачацца літаратуры блізкіх краін; як узаемадзейнічаць творчыя саюзы з уладамі; якой мусіць быць падтрымка пісьменніка — гэтыя ды іншыя пытанні абмяркоўвалі ўдзельнікі круглага стала «Два крылы адной літаратуры», які адбыўся ў межах XXVI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. Па меркаванні старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалая Чаргінца, мэта літаратур братніх краін агульная — развівацца ў імя дружбы народаў і міру ва ўсім свеце і ўсяляк спрыяць гэтаму. Па-першае, пры дапамозе кніг, якія выдаюцца ў дзяржаве. Пісьменнікі павінны прапаноўваць творы, якія знаходзяць водгук у грамадстве, выхоўваць яго, засяроджваць на лёсавызначальных для народа пытаннях. З іншага боку, і творцы чакаюць ад дзяржавы большай увагі і падтрымкі. «Наша грамадскае аб'яднанне дамагаецца павышэння пенсіі літаратарам, якія маюць дзяржаўныя ўзнагароды і чые творы вывучаюць у школе, — зазначыў кіраўнік СПБ. — Пісьменнік — не прафесія, на першы погляд. Але дзякуючы таму, што ёсць пісьменнікі, існуюць і ўсе іншыя прафесіі; на творах пісьменнікаў вучацца дзеці, выхоўваецца юнацтва», — перакананы Мікалай Чаргінец.

Старшыня Саюза пісьменнікаў Расіі Мікалай Іваноў, падзяліўся досведам арганізацыі супрацоўніцтва творчага аб'яднання з мясцовымі ўладамі. Грамадскае аб'яднанне на тое і грамадскае, што не праследуе мэты атрымаць за сваю дзейнасць прыбытак, таму пісьменнікі ўсё ж маюць патрэбу ў тым, каб іх падтрымлівалі. «Цяпер кіраўніцтва супрацоўнічае напрамую з губернатарамі, падпісаны шэраг узаемакарысных пагадненняў. У Расіі таксама няма прафесіі пісьменніка. Але мы самі не павінны сядзець склаўшы рукі ды толькі згадваць савецкае мінулае, дзе роля пісьменніка ў грамадстве была вельмі істотная, — гэта нічога не зменіць, — перакананы Мікалай Іваноў. — Мы захавалі адзінства: нас больш чым 8 тысяч сябраў, 91 арганізацыя — ніводная не распалася, нягледзячы на тое, што няма дзяржаўнага фінансавання».

Адзін цікавы прыклад: калі ў шэрагі СПР прымаюць моладзь, старэйшыя калегі з выхаваўчай мэтай арганізоўваюць для маладых творцаў экскурсіі ў Краснадон, на месца гібелі «Маладой гвардыі». Бо моладзь павінна памятаць гісторыю і ведаць, якая патрэбна літаратура...

З мэтай збліжэння і ўзаемаўзбагачэння літаратур суседніх краін апошнім часам шмат робіцца мастацкіх перакладаў. Так, нядаўна пабачыў свет зборнік лірыкі беларускіх творцаў, перастораных па-чувашску паэтам Валерыем Тургаем. «Вялікае значэнне мае захаванне памяці літаратурных сувязяў. Так, у найбліжэйшых планах творцаў Чувашыі — усталяванне мемарыяльнай дошкі на будынку гасцініцы ў Чабаксарах, дзе жыў Янка Купала падчас эвакуацыі, і на сцяне сталічнага Дома друку, — зазначыў Валерый Тургай. — Усяго два тыдні правёў на нашай зямлі беларускі пясняр, але і па сёння дарагая памяць пра яго».

Пра сумесныя падзеі ў літаратурным жыцці распавёў старшыня Астраханскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Расіі Юрый Шчарбакоў. Ён падкрэсліў, што лёс народаў залежыць ад сяброўства літаратур. Так, прыкладам таго, як можна спрыяць узаемапранікненню дзвюх літаратур, стаў праект узаемаперакладаў. Днямі ў Расіі выйшла кніга Міхася Пазнякова «Маё багацце» (выдавецтва «Джангар», Эліста), перастораная Юрыем Шчарбаковым па-руску. Адначасова ў Беларусі пабачыў свет зборнік лірыкі Юрыя Шчарбакова «Таццянін дзень» (выдавецтва «Коларград», Мінск), перастораны па-беларуску Міхасём Пазняковым.

Па перакананні галоўнага рэдактара вядучага расійскага выдавецтва Георгія Прахіна, адметнай падзеяй у культурным жыцці Беларусі і Расіі стаўся выхад кнігі пра сяброўства і літаратурныя сувязі «М. Горкі і А. Багдановіч: дружба, народжаная на берагах Волгі» (Масква, «Художественная литература», 2018). Папярэднічаў гэтаму абмен навуковымі і архіўнымі адкрыццямі паміж краінамі, работа ў расійскіх архівах беларускіх даследчыкаў.

Згаданыя прыклады можна расцэньваць як падставу для гонару, сцвярджалі выступоўцы. Бо росквіт і ўзаемаўзбагачэнне магчымыя там, дзе няма месца прымусу, навязвання, а ёсць штодзённая мэтанакіраваная, руплівая праца, часам самаахвярная. Як адзначыў пісьменнік, галоўны рэдактар выдавецтва «Художественная литература» (Расія) Георгій Прахін: «І ў Беларусі, і ў Расіі літаратура сёння — як Жана Д'Арк: калі нічога больш не засталося, у вогнішча ідзе яна»...

Яна БУДОВІЧ

ЗАВАРОЖАНЫ КУПАЛАМ

Фота Андрэя Сазонава.

Творы Янкі Купалы перакладзены на многія мовы свету. Цікавасць да спадчыны беларускага песняра не згасае не толькі на Беларусі, але і за яе межамі. У выдавецтве «Мастацкая літаратура» рыхтуецца да друку зборнік Янкі Купалы «Санеты на мовах свету», куды ўвойдзе цыкл яго вершаў, перастораных на чувашскай, чачэнскай, татарскай і іншых мовах. Па-руску санеты пераставрыў паэт Максім Замшаў. Падчас XXVI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу ён прэзентаваў свае пераклады і распавёў, што натхніла на працу.

ПРА НАКАНАВАННЕ:

— Я жыву ў Маскве на Кутузаўскім праспекце, які пераходзіць у мінскае шасэ, а ў скверыку насупраць майго дома ўсталявалі помнік Янку Купалу. І калі паступіла прапанова пераасэнсаваць санеты Купалы, не змог адмовіцца. У інтэлектуалаў Расіі вялікі інтарэс да твораў культавых паэтаў сяброўскіх краін. Хаця на першы погляд і не ўсім зрузумела, нашто спатрэбілася перакладаць вершы Купалы на рускую мову, бо расійскі чытач і па-беларуску прачытае і зразумее, але ўва мне прачнуўся азарт даследчыка, а таксама сімпатыя да беларускіх аўтараў.

ПРА АСАБЛІВАСЦІ ПЕРАСТВАРЭННЯ:

— Праца была складаная: і падрадкоўнік, і тэкст арыгінала… Мне найбольш блізкая сілаба-танічная паэзія, якая амаль ва ўсім свеце скончылася (засталося ўсяго некалькі краін, дзе яна ёсць…). Англійская, французская, частка славянскай паэзіі — там адэкватны пераклад немагчымы, трэба ўжываць дысананснысы рыфмы...

Санеты — адзін з найбольш кампазіцыйна складаных жанраў пры складанай вобразнай пабудове (чым найперш для мяне і цікавыя). Гэта класічная літаратура з налётам сярэбранага стагоддзя. Паэтычны пераклад — вельмі няпростая справа. Бывае, ад арыгінальнага тэксту нічога не застаецца. Калі ж перакладчык вельмі дакладна ідзе за тэкстам, то перастораны тэкст страчвае прывабнасць. А ў выпадку, калі перакладчык паэт, перад ім задача — прыбраць з перакладу ўласныя паэтычныя асаблівасці. Складанасць у перакладзе Купалы яшчэ і ў тым, што ў яго тэкстах небагата рыфмаў: бывае, на санет іх усяго дзве, і гэта пазбаўляе магчымасці зрабіць манеўр.

ПРА АДЧУВАННЕ ПЕСНЯРА:

— Працуючы над тэкстамі санетаў, я зразумеў, што Купала — вельмі беларускі паэт. За кожным радком адчуваецца зямля, гэтыя палі, беларуская прырода, гарачыя пачуцці Купалы да роднай зямлі. Відаць, што паэт вельмі сумаваў па Беларусі. Я імкнуўся ператварыцца ў самога Купалу, думаць яго галавой і пісаць яго рукой — перакладчык мусіць як мага менш пакінуць у тэксце сябе.

ПРА ХРАНАЛОГІЮ:

— Перакладаў санеты ў тым парадку, у якім яны былі напісаныя. І ў гэтым ёсць нейкая цэльнасць, — так перастараць лягчэй, бо можна адчуць рухі душы самога Купалы. Я не прыхільнік падзелу творчасці на цыклы, мне здаецца, што храналогія нашмат цікавейшая для даследчыка.

ПРА ВЫЗНАЧАЛЬНЫЯ ЭЛЕМЕНТЫ Ў ПАЭЗІІ:

— Рытм для Купалы вельмі важны. А тут, акрамя слоў, трэба перакладаць таямніцу руху рытму і рыфмаў. З беларускай мовы таму і цікава перакладаць, калі ты бачыш усе літаркі — як усё пабудавана…

ПРА ТАЯМНІЦУ ПАЭЗІІ:

— Музыкі даносяць сэнс музыкі пры дапамозе нот. Ноты — гэта нешта выключнае, рамантычнае… Мастакі карыстаюцца фарбамі, — тое самае. А паэты карыстаюцца тымі ж словамі, што і ўсе. Калі паэзія будзе зроблена з прыгожых слоў, гэта будзе як гарох у пустым рондалі… Тайна ў тым, што абсалютна тыя ж словы ставяцца ў нейкім асаблівым парадку, з асаблівым рытмам і рыфмай, і ўзнікае вельмі моцная рэакцыя на гэта… Купала — геніяльны паэт, гэта заварожвае...

Яна БУДОВІЧ

Асноўны клопат — кнігі Беларусі. Іх было шмат: тых, што ўжо мелі рэзананс, якіх чакалі і хацелі ўбачыць менавіта тут. І новыя выданні прэзентаваліся айчыннаму чытачу. Што адметна — сёлета не толькі ў выставачным павільёне, але і ў кнігарнях. І на стэндзе пісьменнікаў увесь час віравала жыццё. Не толькі чытанні і прэзентацыі, а нават канцэрты са спевамі імкнуліся прывабіць людзей. Толькі б чыталі, каб лепш зразумець сваю краіну.

Першыя вандроўкі па Беларусі

Адкуль паходзяць назвы ўсіх абласных цэнтраў і некаторых іншых гарадоў? Што азначаюць назвы рэк і азёр? З якімі знакавымі асобамі звязаны канкрэтныя мясціны Беларусі? Пра гэтыя і многія іншыя цікавыя рэчы дзецям (і не толькі) раскажа выданне Дзмітрыя Пятровіча «Дзіцячы атлас Беларусі. Легенды і паданні» (Мінск, «Мастацкая літаратура», 2018). Кніга прысвечана гісторыі і геаграфіі Беларусі і распавядае пра 4 гарады кожнай вобласці. Выключэннем стала Мінская: у цэнтры аўтарскай увагі — пяць гарадоў вобласці: Заслаўе, Капыль, Клецк, Нясвіж, Узда і Мінск. Героі 26 тэкстаў — як міфічныя персанажы (асілак Менеск, разбойнік Машэка, селянін Добруш, князь Альшан), так і гістарычныя асобы (Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, княгіня Рагнеда, князь Радзівіл ды інш).

— Я абапіраўся на першакрыніцы, якія былі ўключаны без апрацоўкі ў зборнік 1980-х гадоў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Затым пераставрыў гэта ў невялічкі агляд па абласцях, адаптаваўшы для пачатковай школы, і зрабіў акцэнт на старажытнасці. Але закрануў і сучаснасць. Кожная легенда ці паданне — перш за ўсё цікавы і лаканічны сюжэт. Ёсць гісторыі літаральна з трох сказаў, — расказаў на прэзентацыі кнігі, якая адбылася ў межах праграмы Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, Дзмітрый Пятровіч. — У тэкстах ёсць шмат цікавых слоў, якія мы спецыяльна не выносілі. Некаторыя з іх я нават прасіў пакінуць, бо было шмат сумненняў, у тым ліку наконт таго, ці рабіць зноскі. Навошта? Тое, што адаптавана для дзяцей, ужо само па сабе шлях да ведаў. Некаторыя педагогі са мной не пагодзяцца, але магу назваць «Дзіцячы атлас Беларусі. Легенды і паданні» вучэбна-педагагічным комплексам дзякуючы міжпрадметным сувязям, якімі выданне адметнае. Працаваць можна з любым урывачкам — на ўроках мовы, літаратуры, гісторыі ці грамадазнаўства ў якасці пераказу, дыктоўкі ці нават інсцэніроўкі сюжэта.

Па словах аўтара, выбар аднаго ці іншага горада для чытання залежыць ад таго, чым займальным і запамінальным можна здзівіць чытача. Некаторыя легенды вядомыя любому беларусу, але знойдуцца і гісторыі, якія дагэтуль нідзе не публікаваліся. У выдання ёсць усе магчымасці, каб стаць першай кніжачкай пра Беларусь для маленькага чытача. У планах Дзмітрыя Пятровіча — стварэнне тэматычных «Дзіцячых атласаў Беларусі»: крэпасці і замкі, птушкі, знакамітыя людзі, музычныя інструменты.

Дарэчы, «Дзіцячы атлас Беларусі. Легенды і паданні» — не першае выданне такога кшталту. У 2017 годзе пабачыў свет першы атлас для дзяцей, які быў прысвечаны гісторыі, прыродзе і культуры. Аўтар арыгінальнага праекта — Паліна Грынчанка.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Фота Кастуся Дробава.

Выйсці з зоны камфорту...

З усіх куткоў Беларусі, а таксама з-за мяжы з'ехаліся маладыя творцы на прэзентацыю выдання «Першацвет», якая адбылася на стэндзе выдавецтва «Мастацкая літаратура». Пераможцы конкурсу маладых літаратараў, чые творы пабачылі свет на старонках альманаха, былі ўзнагароджаны дыпломамі. «Каб рашыцца даслаць творы на суд журы, патрэбна была пэўная смеласць, выхад з асабістай зоны камфорту... Вы здолелі выйсці са сваіх межаў, узняцца над сабой — і аказаліся ў ліку пераможцаў. Жадаю і надалей не замыкацца ва ўласнай прасторы, як мага часцей дасылаць творы ў рэдакцыі літаратурных выданняў», — звярнуўся да прысутных галоўны рэдактар выдавецтва і сябар журы Віктар Шніп.

Дарэчы, стартуе новы, IV сезон конкурсу «Першацвет». Азнаёміўшыся на сайце выдавецтва з яго ўмовамі, на працягу года творцы ўзросту ад 20 да 30 гадоў могуць дасылаць творы на адрас «Мастацкай літаратуры» альбо ў рэдакцыі літаратурных часопісаў і «ЛіМа» з адпаведнай пазнакай.

Адначасова ў кнігарні «Дружба» ААТ «Белкніга» ў межах XXVI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу адбылося адкрыццё паліцы літаратуры Узбекістана. На імпрэзе прэзентавалі перастораную па-беларуску Міколам Мятліцкім кнігу паэтэсы з Казахстана Любові Шашковай «Луг залаты», а таксама альманах замежнай літаратуры «Далягляды» — выданне, дзе прадстаўлена творчасць чатырох знакамітых паэтаў Узбекістана, перастораная па-беларуску. Падчас мерапрыемства паміж прадстаўнікамі Беларусі і Узбекістана быў падпісаны мемарандум аб творчым супрацоўніцтве — як у айчынных кніжных крамах прадстаўлена творчасць узбекскіх пісьменнікаў, так і кнігі беларускіх аўтараў змогуць набываць грамадзяне Узбекістана на іх роднай мове.

Яна БУДОВІЧ

Адкрываем гісторыю

Цікавымі прэзентацыямі праектаў парадавалі чытачоў Нацыянальная бібліятэка Беларусі і Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусі падчас Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі прадставіла электроннае выданне «Станаўленне беларускай дзяржаўнасці: па старонках беларускіх газет 1917—1922 гг.». Гэта плён сумеснай працы бібліятэкі і Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Два дыскі змяшчаюць элктронныя копіі каля 2400 нумароў газет (амаль 80 найменняў) на тэрыторыі сучаснай Беларусі і за яе межамі, якія мелі адносіны да Беларусі. Інтэрфейс двухмоўны: інфармацыя пададзена на рускай і беларускай мовах.

Прэзентацыя калектыўнай манаграфіі «Князі Вітгенштэйны і іх уладанні ў Расійскай імперыі ў XIX стагоддзі» прайшла ў Прэзідэнцкай бібліятэцы. Твор, што складаецца з пяці аб'ёмных раздзелаў, прысвечаны гісторыі роду князёў Вітгенштэйнаў, якія славіліся тым, што валодалі велізарнымі зямельнымі ўчасткамі на тэрыторыях сучасных Беларусі, Літвы, Расіі і Малдовы.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Эмацыянальная серыя

Выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» сёлета прадставіла трохтомнік «Янка Купала». Энцыклапедычнае выданне, якога чакалі, ужо стала адным з кніжных брэндаў Беларусі. Але ёсць асаблівая тэма — 75-годдзе вызвалення Беларусі.

— Летась мы стварылі выданне, прысвечанае трагедыі Хатыні. Кніга невялікая, але выбудавана такім чынам, што выклікае эмоцыі, — адзначае дырэктар выдавецтва Уладзімір Андрыевіч. — Хатынь — нацыянальная трагедыя, сімвал спаленых вёсак, але на нашай зямлі адбылася трагедыя Еўропы — Трасцянец. Сюды звозілі мірных жыхароў з Аўстрыі, Польшчы, Чэхіі, і яны тут загінулі, пра што мы таксама распавялі ў асобным выданні. Мы вырашылі стварыць серыю «Беларусь. Трагедыя і праўда Памяці», дзе ўжо было дзве кнігі. І вось прэзентавалі працяг: «Боль і гнеў. Халакост і супраціўленне ў Навагрудку». Бо чым вылучаецца тэрыторыя Беларусі, якая ўваходзіла некалі ў ВКЛ? Гэта была адзіная дзяржава ў колішняй Еўропе, якая прымала людзей яўрэйскай нацыянальнасці, дазволіла ім асесці і мець сваю справу. Наступную кнігу мы рыхтуем пра Масюкоўшчыну, дзе загінула больш як 80 тысяч ваеннапалонных. Гэта новы пласт вялікай трагедыі Другой сусветнай. Падчас прэзентацыі мы зразумелі, што для нашага выдавецтва гэта серыя будзе знакавая.

Марыя АСІПЕНКА

Прыватнае / непрыватнае жыццё

ў разуменні нобелеўскага лаўрэата

Сустрэча, якой чакалі. Меркаванне, якое захацелі пачуць. І не саромеліся ўступаць у спрэчку простыя наведвальнікі кніжнай выстаўкі, якія запоўнілі залу на сустрэчы з лаўрэатам Нобелеўскай прэміі па літаратуры Святланай Алексіевіч. Яна адказвала прыязна ўсім: не як мэтр, а як чалавек, які можа ў нечым сумнявацца, не прэтэндуе на ісціну ў апошняй інстанцыі, але шукае адказы для сябе сама і прапануе гэта рабіць іншым, углядаючыся ў свет і імкнучыся знайсці сваё месца ў ім.

Дзеля гэтага яна збіраецца аднавіць работу свайго інтэлектуальнага клуба, адным з гасцей якога хутка можа стаць амерыканскі гісторык Тімаці Снайдэр. Чытае кнігі і сочыць за беларускім літаратурным працэсам. Разважае пра шляхі і трагедыі нашай нацыянальнай культуры, якая ў першай палове XX стагоддзя страціла вялікую частку эліты. Але народ здолеў захаваць сябе ў часы ліхалецця, пры тым, што мінулая эпоха пакінула адбітак у свядомасці:

«Калі пісала кнігі, часам у слязах пасля сустрэчы ішла дадому і думала: чалавек перажыў такія пакуты, але чаму, як толькі загаворыш пра сённяшняе жыццё, бачыш перад сабой раба, які прымае гэта ды яшчэ і Сталіна можа любіць у дадатак. У нашым чалавеку гэта неяк суіснуе. Ён хоча мець і шэнгенскую візу, і партрэт Сталіна ў доме». Але мінулае патрэбна асэнсоўваць, каб не страціць будучыню: «На нас адказнасць за новых людзей, якія ў нашых сем'ях, у школе, вось за іх трэба змагацца».

«Я больш за ўсё баюся крыві. Усё, што заўгодна: можна жыць і без гарачай вады, але ўсё-такі без крыві. Гэта самае галоўнае… Ёсць досвед Украіны, вельмі трагічны, маёй любімай краіны, дзе гінуць маладыя людзі. Я не хацела б такога», — адзначыла Святлана Алексіевіч і патлумачыла, чаму пасля няпростых тэм, што былі ў яе творчасці, вырашыла напісаць пра любоў і каханне:

«Гаворка пра тое, як людзі хочуць быць шчаслівымі, што наогул для гэтага трэба. Што галоўнае ў жыцці, чаму мы так зневажаем прыватнае жыццё. А гэта можа быць і ёсць чалавечае жыццё. Калі ты думаеш пра дзіця, думаеш пра жанчыну ці мужчыну, думаеш, што на свята павінны быць пірагі, што ў нядзелю трэба кудысьці вывезці сваіх…

Я падумала, што наступная кніга павінна быць пра тое, што жыццё дадзена для нечага іншага. Дадзена не для таго, каб танна памерці дзе-небудзь ці забіць кагосьці на краі свету.

Калі пачытала шмат твораў з рускай літаратуры, якія мне здаваліся пра каханне, раптам высветлілася: усё роўна канчаецца або рэвалюцыяй, куды сыходзіць каханы, або як Вронскі едзе гінуць у Балгарыю. Заўсёды любоў не мае працягу. Калі каханне не проста як "пачатак кахання", назавём гэта так, а як сям'я, дзіця.

Мужчыны там няма, мужчына для нечага іншага ў нашай літаратуры. Ён існуе або на вайне, або ў турме, або на даху рэактара. Але не дома. Я памятаю, калі ішло скарачэнне арміі, дадому вярнуўся палкоўнік. Жанчына змагла перастроіцца, пачала працаваць цырульнікам, каб сям'ю выцягнуць. А гэты велізарны мужчына хадзіў па кватэры і скрыгатаў зубамі: "Няўжо я кашу павінен варыць? Што гэта за праца: адвёў дзіця, прывёў дзіця…". Я кажу: "А пасядзець, пачытаць яму казку?.." Ён глядзеў на мяне так, быццам я кажу дзікія рэчы. Не, яму патрэбны начныя палёты ў лётнай часці, ён павінен ахоўваць граніцу Радзімы. А сям'я не лічылася галоўнай справай. Вось тады я і вырашыла напісаць пра гэта».

Ды ці можа быць нешта больш галоўнае за тое, на чым трымаецца жыццё? «Што можа быць важнейшае за любоў?» — падсумавала пісьменніца і прызналася: усё, што яна пісала дагэтуль, у прынцыпе, было пра тое...

Ларыса ЦІМОШЫК

Тацяна НЯДБАЙ

***

Вось бывае так: знаёмішся з нейкім
хлопцам,
Балбатня нязмушаная, лёгка і весела
так,
Скайп-кантактамі абмяняліся, выбралі
опцыю
«Пасябраваць» на Фэйсбуку, колькі
смайлікаў у лістах.

Далей — перадышка на працы й
супольная кава ў анлайне
З парай показак і цытат — копі-пэйст,
гіперлінк, інтэрнэт,
Нічога прыватнага і асабістага.
А віртуальны лайнер
Вас пасля вяртае — кожнага да сваіх
планет.

Магчыма, вы нават пашчыруеце неяк
увечары —
Яму заўтра да бацькі ехаць у вёску,
перакапаць агарод,
І сярод гэтых размоваў ты ўявіш сябе
з ім у вечнасці,
Уявіш вочы дзяцей і ўнукаў,
якія працягнуць ваш род.

І ловіш сябе на думцы: мамы ў яго ўжо
няма, акей, хаця
Ёсць агарод — трэба будзе палоць
памідоры,
Дом пад Мінскам — гэта, вядома,
з плюсаў, але вырашаеш: працяг
Немагчымы, бо іншыя ў цябе планы —
жыць ля мора.

А з ім — проста добра перакінуцца
цёплымі словамі,
Пазычыць салодкіх сноў і пачуць,
што ты прыгожая.
Бо вы разам з ім да паловы начы,
нібы да жыцця паловы,
Заседзеліся, дык кожны расчуліцца можа.

А ён жа зусім не той, ты кажаш сабе,
зусім не такі —
Порткі з трыма палоскамі, памідоры
з дзядоўнікам, трункі
Такія, што ты не п'еш. Ты б не ўзяла.
А возьмеш — кінь.
Але бялізну пайшла і выбрала ў краме
з карункамі.

Пасля зазірнеш да яго ў Фэйсбук,
а там нейкая краля — Лера.
Не сястра нібы, не пляменніца і —
па фотцы — нічога ў ёй асаблівага.
А ён ужо з паўгадзіны анлайн і табе
не піша нічога, халера,
А ты ўжо з паўгадзіны глядзіш
на статус і думаеш — блін!

Ну і ладна! Няхай яна й мые яму посуд,
гатуе абеды,
Пад дзядоўнікам памідоры гадуе,
глядзіць старога,
І ты зараз яму сама напішаш, каб ён
проста ведаў,
Што ты ўсё адно не пусціла б яго
далей парога,

Што цябе дастала гэтая бытавуха,
што ён злыдзень,
«Паматросіў і бросіў», а ты дзеля яго —
эпіляцыю воскам.
І што з таго, што ты з ім знаёмая
ўсяго тыдзень —
З хлопцам, які носіць порткі з трыма
палоскамі.

***

прачынацца і
выкарчоўваць сэрца

свайго бліжняга
ненавідзець лішняга
як костачкі з вішняў
вымаць пальцамі

дзёрзкімі словамі
цягучымі смоламі
ляжаць голымі
выпадковымі пастаяльцамі

не джэкпотаў прага
не букмекерская смага
не жар-птушкі, не магаў
не цудаў хачу чароўных-наварожаных

ад жыцця — жыцця
гаючага пачуцця
а нібы няўцям
як яшчэ бывае як можам мы

прачынацца ў палоне
мяккіх далоняў
пахкіх півоняў
водары яблыкаў з уласнага саду

як ядвабных пялёсткаў
пацалункаў порсткіх
і каб дажджы касыя хлёсткія
асеннія а мы ў цеплыню ложка падаем

каб свяціў маяк
каб было як
расціснуць кулак
і расказваць сны прачнуўшыся
на світанні

каб штарміла мора
й адганяла ворагаў
а не нас у мораку
смугой ледзяной вітала

***

так пахла ліпамі з усіх гарадскіх двароў,
масты, як коткі, свае выгіналі спіны,
прымружвалі вочы салодка пад ліхтароў
паглядамі дзіўнымі,

і мы кахаліся на даху, як галубы,
ды мы ўсміхаліся пілотам аэрапланаў,
бясстрашным вікінгам ты ўвайшоў
сюды,
каханы,

і столькі радасці прыносіў твой
кожны рух,
хавала ад шчасця слёзы ў тваіх далонях,
і ў садкіх смаках вуснаў, цела, рук
і ўлоння,

і мы засыналі адным на дваіх сном,
на адной хвалі ўлюбёнай FM з
джэм-сэйшнамі,
так пахне астрамі цяпер
за маім вакном,
а табой ад мяне пахне
па-ранейшаму

***

Цёмныя бяссонныя вулкі
Дзе золата становіцца меддзю
Бадзяюся ў пошуку прытулкаў
Пакуль ты да мяне не едзеш
Патанаю кусаючы вусны
У сполахах успамінаў цела
Дзе табе да валасоў русых
Прытуліцца шчакой карцела

Віктар КАЖУРА

ПА ПРАВЕ ПАМЯЦІ І ЛЮБОВІ

***

Па якім праве
ты ўрываешся ў мае сны
і блытаеш імёны і даты?
Па якім праве
ты ўрываешся ў мае мары,
узводзіш палацы,
а раніца руйнуе іх?
Па якім праве
ты ўрываешся ў маё сэрца,
прымушаючы яго трымцець
лістком на зімовым ветравеі?
Па якім праве
ты ўрываешся ў маю душу і
прымушаеш яе — безгалосую — спяваць?
Па якім праве?..

***

Гордая. Пакутная. Шчаслівая —
Ластаўка на крылах навальніцы.
Звонкая. Іскрыстая. Гуллівая —
Песня жыццядайнае крыніцы.
Шчодрая. Пяшчотная. Руплівая —
Матылёк на верасе былінцы.
Недасяжная. Святая. Мілая —
Промнік сонца ў ранішняй расінцы.

Вяртанне

Ночы мае
Наталялі
Халодныя знічкі
Чакання.
Вочы мае
Сплывалі
Мройным прывідам
Спаткання.
Рукі мае
Шукалі
Прагнага цела
Вяртання.
Словы мае
Блукалі
У бездані зорнай
Прызнання.
Вусны мае
Апякалі
Спалохі твайго
Дыхання.
Вейкі твае
Трапяталі —
Вярталася наша
Каханне.

***

Ціхім рэхам гукніся:
— Чакаю! —
І душу адпусці ў небасінь.
Я пачую. З далёкага краю,
Як закляцце, шапну:
— Не пакінь!
Твае вейкі ўзляцяць матылькамі:
— Ты мне, любы, адно толькі — вер!.. —
І анёл усміхнецца над намі:
Двое…
Шчасце…
Каханне...
Давер.

***

Я прад табою стану на калені
І рукі зябкія да вуснаў прытулю —
Заззяюць вочы сонечным праменнем,
І рэха шчасцем адгукнецца:
Я — ЛЮБЛЮ!

***

Лёгкі дотык твайго дыхання
На дасвецці празрыста-веснім
(Праз бяссонныя ночы чакання)
Стаў бясконцаю ПЕСНЯЙ ПЕСНЯЎ..

Валянціна ПІСАРЧЫК

Успамін

Светлай памяці
любай сяброўкі Таццяны Каваленкі

А мы такія, як былі…
Хіба што крыху пасталелі
І нас не гойдаюць арэлі.
Мы сталі бліжай да зямлі —
Жыцця мы сутнасць зразумелі.
І ўсё ж…
Цэнтральны сквер. Хлапчук і лебедзь.
І галасоў званочкі ціхіх
Ледзь
чутныя
далёка
недзе…

У незнаёмым горадзе

Вы ў незнаёмым горадзе
Забытае прыпомніце
І ціха засумуеце
Аб тых, хто вас чакаў…
Снег пачарнелы згорнеце,
Нібыта перагорнеце
Дзень у далёкім горадзе,
Дзе вас не сустракаў
Ніхто…

Мімоза

Паводле карціны Міколы Селешчука
«Матылькі тут не жывуць»

Нічога не змяняецца,
Калі
Мімозы вянуць
У крышталі крохкім.
Здаецца свет заблытаным
І лёгка
аддацца
здрадзе,
крыўдзе
і мане.
Усё міне?..
А ці ўсё міне?!

Белая герань

Як не па часе
Зацвіла герань —
Апошні водгук
Першае сустрэчы.
Шапчу ў здзіўленні
Ледзьве чутна: «Глянь:
І першы снег,
І белая герань…»

Ноч

Ціхая ноч, зорная ноч…
(з каляднай песні)

Вось яна, высокая прастора…
Нікне смутак і знікае гора,
Што душу скавалі так учора.
Іх няма.
Ёсць толькі цішыня,
Неба ў зорах
І малітва Богу —
Ад бяды ліхой перасцярога
У чаканні заўтрашняга дня.

ДЗЯЎЧЫНА МАЁЙ МАРЫ

Наталля КАНСТАНЦІНАВА

Апавяданне

Чаканне было хвалюючае. Яно прыемна ўзбуджала кроў, змушаючы песціць неверагодныя, чароўныя надзеі. Сёння пачнецца новы этап майго двухмесячнага рамана, які са свету віртуальнага павінен перайсці ў рэальны. Таму я стаю ля ўвахода ў цэнтральны ўнівермаг з вялікім букетам ружаў. Шчыра кажучы, у мяне нават крыху дрыжэлі рукі, калі я апранаўся перад спатканнем. Так шмат я ад яго чакаў.

Калі два месяцы таму на сайце знаёмстваў мне напісала «Вітаю!» незнаёмая дзяўчына, спачатку я вырашыў не адказваць. Я заўсёды так раблю, калі анкета без фота. Ці мала хто можа хавацца за мілым жаночым імем і прывабным асабістым апісаннем! Пагатоў, у гэтым выпадку і яно адсутнічала. Ні росту, ні вагі, ні колеру валасоў і вачэй, ні цікаўнасцяў. Толькі ўзрост — 28 гадоў. Сама па сабе лічба мяне задавальняла. Гэта час квітнення, якое па-ранейшаму працягваецца, але ўжо без сутаргавых парываў юнацтва, без няўрымслівых жаданняў. Акурат тое, што адпавядае маёй сфарміраванай разважлівасці, якая ў дадатак прагнула здаровай рамантыкі. Аднак дзе гарантыя, што і ўзрост незнаёмка пазначыла рэальны? І што гэта ўвогуле незнаёмка, а не незнаёмец? Ці мала які весялун захоча пажартаваць, каб потым заходзіцца ад рогату разам з сябрамі, чытаючы прызнанні ў палкіх пачуццях, якія здолеў выклікаць у «лоха»? Або ці мала з дзяўчынай у рэале. Яна пагадзілася і прызналася, што доўга чакала такой прапановы, бо ад пачатку па анкеце я яе вельмі зацікавіў. «Ну хоць цяпер ты дашлеш фота, каб я мог цябе пазнаць?» — напісаў я. «Не, не хачу, няхай мая знешнасць будзе для цябе сюрпрызам, — запярэчыла Насця. — Дамовімся дакладна пра месца і час сустрэчы, і тады адно аднаго пазнаем, не памылімся». Я ўжо гатовы быў на ўсе яе ўмовы. Дзяўчына, настолькі мілая і разняволеная ў віртуальных размовах, не можа быць непрывабнай. Бо дэфекты знешнасці звычайна спараджаюць комплексы, панурасць, нядобразычлівасць. А Насця вясёлая, інтэлігентная, добрая.

Такім чынам, я стаяў каля ўвахода ў цэнтральны ўнівермаг з вялікім букетам ружаў у прадчуванні найвыдатнейшай падзеі ў сваім жыцці. Але ўжо праз колькі хвілін пачаў паглядваць на гадзіннік: дакладны час сустрэчы мінуў. Натуральна, я дапускаў думку, што большасць дзяўчат адмыслова вытрымліваюць час, каб спраўдзіць галантнасць і сур'ёзнасць намераў кавалера. Калі перада мною спынілася «гэта», я неяк і не падумаў суаднесці пабачанае з тою, якую чакаў. Зрабіў ветлівазапытальны твар і падрыхтаваўся даць кансультацыю пра месцазнаходжанне якіх-небудзь гарадскіх аб'ектаў ці рух транспарту. Але «гэта» хрыпла вымавіла: «Ты Дзімка?» Ад нечаканасці я выдаў нешта накшталт: «Э-э-э…» — але потым, крыху падумаўшы, прыйшоў да высновы, што можна назваць мяне і так, хоць гэтага даўно ніхто не рабіў, і машынальна кіўнуў. «А я Насця», — з гонарам паведаміла «гэта». Я маўчаў, дурнавата ўсміхаючыся. Сказаць, што я чакаў чагосьці іншага, — значыць нічога не сказаць. «Гэта» ўвогуле ні ў якія вароты не лезла. Цёмныя штаны ў буйны гарох абцягвалі сцёгны, кожным з якіх, напэўна, можна было забіць, і ледзьве не трашчалі на масіўным азадку шырынёю ў два, а то і тры звычайныя. У цэлым штаны выглядалі як піжамныя і рабілі караценькія ножкі яшчэ карацейшымі. На ступаках боўталіся разношаныя, зацертыя пантофлі. Над штанамі навісаў голы вялізны друзлы жывот з пірсінгам. Кароткі топ адкрываў рукі, падобныя да перацягнутых каўбасаў, а грудзі тырчалі наперад, нібы тарпеды. Галава ляжала на «стосе» з трох бліноў. Вачэй амаль не было відаць пад пластом касметыкі. Увенчваў гэтую жахлівую фігуру шорсткі начос, што складаўся з асобных бурачных, лімонных, зялёных і фіялетавых пасмаў.

«Што, ачмурэў ад маёй прыгажосці? — спытала стварэнне пракураным голасам. — Не саромейся, хлопча, спачатку я ўсіх ашаламляю. Ты таксама нічога, хаця...» — тут яна прыдзірліва агледзела мяне з галавы да ног, і я адчуў сябе маленькай кузуркай. «Ха, што гэта ў цябе за абутак? — насмешліва сказала Насця. — Гэта адстой, модныя хлопцы цяпер такога не носяць. Ты павінен быць у красоўках». Я, натуральна, ведаў, што сучасны стыль зрабіў красоўкі ўніверсальным абуткам. І ўсё ж для першага спаткання абраў больш класічны варыянт, каб падкрэсліць важнасць моманту. «Джынсы нейкія стараватыя, — працягвала крытыкаваць мой выгляд Насця. — Не самы модны брэнд. А кашуля... Што за колер! Нейкі блакітны! Гэта для батанікаў. Сур'ёзны мужык павінен быць у чорным. Ну нічога, красунчык, — тут кашмарная дзеўка паблажліва паляпала мяне па плячы, — сыдзе і так». На працягу ўсяго маналога я так і не здолеў вымавіць ні слова. Маё нутро запоўніў натуральны страх, а ў скронях білася думка: «Ува што я ўліп?» Выгляд і паводзіны Насці, у параўнанні з вобразам, які паўставаў з перапіскі, так мяне паралізавалі, што я нават не мог развярнуцца і сысці. «Ну хопіць стаяць слупом. Хадзем у рэстаран», — скамандавала дзеўка. Тут я нарэшце знайшоў у сабе сілы выціснуць некалькі слоў: «Але я думаў, мы спачатку проста пап'ём кавы, для знаёмства…» «На фіг, кавы ў мяне і дома хапае, — безапеляцыйна заявіла Насця. — Я заўсёды адразу іду з мужыком у рэстаран, каб праверыць, ці ёсць у яго грошы. Як кажуць, хочаш дзяўчыну-люкс, будзь гатовы раскашэліцца. У цябе ж ёсць грошы?» — яна патрабавальна паглядзела на мяне. Як загіпнатызаваны, я адказаў: «Так, вядома ж». Зарабляў я добра, і на картцы ў мяне была прыстойная сума. Вось толькі траціць шмат я не збіраўся, але нахабны націск дзеўкі проста прыдушыў маю волю. Да таго ж у маёй душы паміраў чароўны вобраз мілай дзяўчыны, на сустрэчу з якой я настроіўся. Яго агонія была такая пакутлівая, што, расціснуты болем, я страціў усялякую здольнасць супраціўляцца. «Гэта мне? Давай», — Насця літаральна вырвала з анямелых рук букет. Потым схапіла мяне пад руку і рашуча скіравалася ў бок дарагога рэстарана, што быў паблізу. Я бязвольна паплёўся за ёю.

У рэстаране Насця замовіла ледзьве не палову меню. Гучна чвякаючы, яна паглынала стравы адну за другой і патрабавала, каб я расказваў анекдоты. Я ачмурэла маўчаў. «Э-э, ды ты зусім не вясёлы, — працягнула Насця. — Ну добра, я сама». І пачала адзін за другім баяць анекдоты самага непрыстойнага зместу. У мяне жудасна разбалелася галава. Раптам у монстрыхі зазваніў тэлефон. «Алё! — адказала мая мучыцелька. — Які Дзіма? Я з Дзімкам ужо ў рэстаране». Яна слухала, і твар яе змяняўся. «Ой, зразумела, зразумела, коцік, — правуркатала яна, наколькі дазваляў яе грубы голас. — Зараз прыйду». Потым паглядзела на мяне зняважлівым позіркам: «Слухай, ну ты і тупы! Гэта ж не з табой мы павінны былі сустрэцца! Мой Дзіма спазніўся і цяпер чакае мяне каля ўнівермага. А то я думаю, нешта ты да фоткі ў анкеце мала падобны. Ну ты і лох!» Нават не выцершы вусны сурвэткай, дзеўка хутка ўстала і пабегла да выхаду.

Я сядзеў з такім адчуваннем, быццам мне скасавалі смяротны прысуд. Нават астранамічны рахунак, які я вымушаны быў аплаціць, не азмрочыў маёй радасці. Галоўнае — сталёвыя кіпцюры пачвары расціснуліся, і я апынуўся на волі. Увесь кашмар аказаўся проста сном, мрояй. Цяпер я прачнуўся. «Але калі гэта не тая Насця, — раптам трапіла думка, — можа, і мая спазнілася і ўсё яшчэ чакае на прызначаным месцы?» Хутка расплаціўшыся, я паспяшаўся да ўваходу ў цэнтральны ўнівермаг.

Яе я заўважыў здалёк. Дзяўчына ў вясёленькай сукенцы, але з сумным, пакрыўджана-разгубленым выразам на твары. Хвалістыя русыя валасы аблямоўвалі прыўкраснае аблічча. Я паскорыў крок. Калі наблізіўся да дзяўчыны, яна нясмела паглядзела на мяне і тут жа адвяла позірк, нібыта баялася паверыць і памыліцца, што я сапраўды падышоў да яе. «Вы Насця?» — выдыхнуў я. Шчокі дзяўчыны запунсавелі, і яна расквітнела ўсмешкай.

Я, Жанна Марозава, была вельмі задаволеная сабою. Чарговая афера скончылася поўным поспехам. Нездарма ж я мела дыпломы філолага і псіхолага! Схема была дакладна адпрацаваная. Спачатку я выбірала на сайце знаёмстваў прыстойнага мужчыну, які ў графе «даход» пазначыў «вельмі добра зарабляю», станоўча адказаў на пытанні анкеты пра кватэру і машыну, адзначыў сур'ёзныя захапленні. Потым уступаю з ім у перапіску і, карыстаючыся сваімі ведамі, выклікаю да сябе гарачую сімпатыю. Згаджаюся на непазбежную прапанову аб сустрэчы. І вось тут выцягваю з калоды джокера — сяброўку Іну. Сваім выглядам і манерамі Інка здольная любога мужыка запалохаць да паралічу волі. Асабліва калі ён ужо размяклы ад ружовых мар. Калі ён бездапаможна трапечацца ў яе кіпцюрах і ў душы аплаквае свой горкі лёс, даецца «адбой». Мужык невыказна ўсцешаны збавеннем. Сустракаючы потым мяне, мілую і сціплую, ён па кантрасце з жахлівай Інкай так у мяне ўлюбляецца, што адразу гатовы на ўсё. Апошняя мая ахвяра, Дзімка, напрыклад, на першым жа спатканні падарыў мне залаты ланцужок, на другім — завушніцы з брыльянтамі. А на трэцім зрабіў прапанову, купіў заручальныя пярсцёнкі і аддаў мне на захаванне да вяселля. Болей, вядома ж, ён мяне не пабачыць, бо ўсё, што я яму пра сябе напляла, уключаючы месца жыхарства і працы, вельмі далёкае ад праўды. Гэтая схема дзейнічала заўсёды. Такім манерам у мяне ўжо назбіралася вялікая калекцыя каштоўных упрыгожванняў, і я не збіралася спыняцца на дасягнутым. Інка ж падчас аперацый атрымлівала магчымасць адпомсіць мужыкам, якія звычайна з яе кпілі, і добра пад'есці. Так што ўсе былі задаволеныя. Акрамя, вядома ж, ахвяраў. Але яны самі вінаватыя — няма чаго быць такімі боўдзіламі! Дарэчы, ужо час пачынаць чарговае паляванне. Я звыкла зайшла на сайт знаёмстваў...

Назрул ІСЛАМ

Мой маніфест

Я паэт сённяшніх будняў,
Не туманных часоў прарок.
Ці прызнаеце вы паэтам
Зноў мяне або не, сцярплю.
Мне гавораць: «Ты некалі станеш
Знакамітым, як Рабіндранат».
А пакуль, уздыхнуўшы цяжка,
Адвяргаюць вершы мае.

Гавораць, я стаў ніякім,
Стаў палітыкам, балбатуном,
Кажуць, што вінаватая жонка,
Што збаёдала талент мой.
Кажуць, што патаўсцеў, сплю многа,
Што я ў карты іграць прывык,
Кажуць, што ў турме быў паэтам,
Трэба, кажуць, зноў у турму.

Мне каханая зноў лістуе.
Выгаворвае нешта мне,
Індуісты пакрылі ганьбай,
Называюць джабонам мяне.
Мусульмане клічуць кафірам,
Усе мулы мне шлюць праклён,
Зневажаюць імя маё.

І прыхільнікі сацьяграхі
Разам ганяць імя маё.

Быццам я нібы гвалту скрыпка,
Быццам толькі хачу крыві.
І крычаць пра незадавальненне
Бунтары самых розных масцей,
Ён працёўнік наш, яны кажуць,
Пра жалейку вершы яго,
«Міратворац», гавораць яны.

Стараверы — сябры традыцый,
Нігілістам клічуць мяне.
Мне наватары заяўляць,
Што Канфуцыя вучань я.
Свараджысты паўсюль сцвярджаюць:
«Ён свароджа вораг заўжды».
Ну а ворагі скваpаджыстаў
Кажуць, што я для іх чужы.

А мужчыны мне ўслед гавораць,
Што жанчын я моцна люблю.
А жанчыны ў адказ сцвярджаюць,
Што я ёсць ненавіснік іх.
Пра мяне часопіс «Прабашы»
Напісаў, што невук Назрул,
Што ніколі не быў за мяжою
Гэты модны новы паэт.

Хопіць, мілыя! Мышцы сэрца
Моцна стрымліваю, маўчу.
Сёння час наш — душы кайданкі,
Пішам са схіленай галавой.
Напішу — брытанскія ўлады
Усё адымуць, заткнуць мой рот.
А душа палае і рвецца,
Вызваляецца ад ланцугоў.

Гавару я палітыкану:
Паспяшайся, прыйшоў твой час.
Выбі слёзы з вачэй народа
Ты гарачай прамовай сваёй.
Ты спяшайся, пакуль не позна.
Станавіся правадыром.
Падпявай самым модным песням,
Набівай кішэні свае.

Мама кажа: «Маўчы сыночак,
Вось наступіць сварадж, цярпі!»
Што важней для дзяцей галодных:
Кубак рысу або сварадж?
Чуеш, плача хлапчук галодны —
Усё нутро спапяляе агонь!
Я гляджу на яго — шаленства
Засцілае вочы мае.

Накажы, Божа, вас усіх, сытых,
Самых быццам святых людзей.
Ешце, ешце, хапайце ежу
З роту гэтых галодных людзей!
Бачу матак, што ходзяць ноччу,
Просяць міластыню ў вас,
А ў іх бедных, нямых хацінах
Халадзеюць цельцы дзяцей.

Сябра мой, я казаць не ў сілах.
Яд раструшчвае сэрца маё
Ад таго, што бачу і чую,
Закіпае гнеўная кроў.
Я пяро ў яе акунаю —
Болей нечым! — крывёй пішу.
Хай пра шчасце спявае шчаслівы,
Я не смею! Я не магу!

Не баюся жыцця, ні смерці.
Сонца ўстала над галавой.
Нават раптам калі загіну,
Застаюцца сотні сяброў.
Аднаго хачу я: каб толькі
Агнявыя вершы мае
Спапялялі тых, хто ў бедных,
Вырываць хоча з роту хлеб!

Песня студэнтаў

Мы — сіла ведаў,
Мы — студэнты.
Над намі летакі лунаюць.
Мы — сіла ведаў.
Мы — студэнты.

Адольваючы перашкоды,
Мы крочым разам басанож.
І кожны крок крывёй прыкметны,
Здабыты смеласцю і праўдай.
Сусвет пакрыты той крывёю
І крыватачыць.
Мы — студэнты.

Мы ў свеце — вечныя каметы,
Нам падуладны час няспынны.
Ахвяры мы. Ды ёсць надзея,
Што гэта будзе не дарэмна.
Мы ў бездань неба узлятаем,
Ў яго святыні —
Мы — студэнты.

Каня за цуглі мы трымаем,
Які ўжо зацугляны смерцю.
Мы крочым мужна у бяссмерце,
Хаця смяротны будзе кожны.
І ў смех людскі ўварвёмся плачам,
Рыданнем гучным.
Мы — студэнты.
Калі дакладнасцю ўсе трызняць,
Мы памыляемся упарта.
Калі ўсе ўзводзяць толькі дамбу,
Мы бераг ўзломліваем дружна.
Дарога наша стала слізкай
Ад той крыві юначай нашай.
Мы — студэнты.

Ў вачах палае факел ведаў.
У сэрцах — слоў гарачых пошчак,
У іх гарыць эпохі заклік,
Які заўжды навек праўдзівы.
Мы — белы лотас Сарасваці
Крывёй пазначым.
Мы — студэнты.

За рэвалюцыю мы гінем
У светлы дзень яе пачатку,
Каб не рыдала ў горы раптам
Стагоддзя нашага свабода.
Мы плачам гордым напаўняем
Наш край пакутны.
Мы — студэнты.

Мы пішам будучыні кнігу,
А ў ёй — надзея і трывога.
І Шляху Млечнаму падобна
Накрэсленая нам дарога.
Хай яваю прыгожай стануць
Народа мары.
Мы — студэнты.

З бенгальскай.
Пераклад Навума ГАЛЬПЯРОВІЧА

ДАСТУКАЦЦА ДА СЭРЦАЎ

Досвед мастацкага перакладу: сэнс, данесены насуперак адлегласцям

Шматлікія турботы пра неабходнасць удзяляць увагу перакладной літаратуры маюць вынік: у межах XXVI Мінскай кніжнай выстаўкі-кірмашу прэзентаваліся кнігі аўтараў з розных краін у перакладзе на беларускую. Кнігі для дзяцей, кнігі для дарослых, што выйшлі ў Беларусі, акрамя ўласна аўтара, маюць яшчэ аўтара перакладу: гэта асобны від працы са словам, калі яно павінна гучаць дакладна, каб перадаць сэнс і адпавядаць кантэксту, ды быць зразумелым сучаснаму чытачу. Выстаўка спрыяе ўстанаўленню кантактаў і актывізуе цікавасць да перакладу, у тым ліку праз адмысловыя семінары. Адзін з іх прайшоў на філалагічным факультэце БДУ, ён быў арганізаваны Міністэрствам інфармацыі Беларусі ў супрацоўніцтве з кафедрай тэорыі літаратуры.

Тэма семінара — «Прафесія: перакладчык» — прыцягнула ўвагу як гасцей, што ўдзельнічалі ў міжнародным сімпозіуме «Пісьменнік і час», так і непасрэдна беларускіх філолагаў ды творчую моладзь, якая неўзабаве можа далучыцца да справы літаратурнага перакладу. І ў Беларусі ёсць свая школа, свае напрацоўкі ў гэтай галіне, пра што казалі намеснік дэкана філалагічнага факультэта БДУ па вучэбна-метадычнай рабоце Мікалай Хмяльніцкі, загадчык кафедры тэорыі літаратуры Таццяна Марозава. Самі выкладчыкі факультэта з'яўляюцца добрым прыкладам для моладзі ў галіне мастацкага перакладу, напрыклад, Вячаслаў Рагойша, Таццяна Кабржыцкая, Таццяна Шамякіна, Іван Чарота, Міхась Кенька. Ствараюцца пераклады з розных моў, актыўнае супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з Кітаем спрыяе развіццю літаратурных стасункаў, адпаведна, да нас прыходзіць больш перакладных кніг з кітайскай мовы. Акрамя таго, беларуска-кітайскія літаратурныя сувязі вартыя асобных даследаванняў, што пацвердзіла выкладчык кафедры кітайскай філалогіі Вераніка Жукавец.

Але семінар — гэта найперш абмен досведам. Таму вядучая, супрацоўніца вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору кафедры тэорыі літаратуры Маргарыта Латышкевіч прадставіла гасцей, якія падзяліліся досведам перакладчыцкай практыкі ў сваіх краінах. Скарбонка кніг на філфаку папоўнілася іх выданнямі: каб не толькі тэарэтычныя кнігі, але і практычны вынік перакладной працы быў навідавоку ў студэнтаў.

Што ў адказ? Для ўдзельнікаў сустрэчы падрыхтавалі своеасаблівае гістарычнае падарожжа ў свет беларускай культуры — вядома, праз слова, але ў тэатралізаваным варыянце гучання, зноў-такі паводле айчыннай традыцыі. Спектакль беларускай батлейкі «Жалобная камедыя пра Адама і Еву» (ад узорнага тэатра лялек «Сонейка» культурна-спартыўнага цэнтра Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі) заснаваны на адаптаваным тэксце п'есы Сімяона Полацкага. Таксама свайго роду пераклад: для нас, каб было больш зразумела жыхару сучаснай краіны, але і пераклад з мовы аднаго мастацтва на мову другога мастацтва. І прыклад таго, якія шляхі (часам няпростыя ці нават доўгія па часе і адлегласці) выбірае мастацкае слова, каб дастукацца да сэрцаў.

Марыя АСІПЕНКА

УЗНЁСЛА. СУПЕР

Здавалася б, эпоха традыцыйнай айчыннай прозы канула ў Лету, пакінуўшы пасля сябе толькі запыленыя тамы выбранага ў кутках бібліятэк. Каго цяпер могуць яны зацікавіць: аднатыпныя, без асаблівай сюжэтнай разнастайнасці творы пра вёску, пра выпускнікоў школы, маладых настаўнікаў і аграномаў, пра першае каханне, расчараванні і душэўныя ўздымы?

Няўжо сапраўды гэтая наіўная і шчырая, безабаронная перад сучасным светам літаратура назаўсёды засталася ў аналах гісторыі?

Так склалася, што пераважная большасць беларускіх пісьменнікаў XX стагоддзя паходзіла з вёсак — там у першароднай чысціні захоўвалася галоўнае культурнае багацце Беларусі — мова. Разам з гэтым у горадзе (маецца на ўвазе Мінск, бо, як Мекка — мусульман, менавіта сталіца прыцягвала ва ўсе часы амбітных творцаў) усё глыбей пускалі карані і мацнелі кланы патомных былых вяскоўцаў, якія з'яўляліся носьбітамі беларускай культуры. І вось у ліхіх 90-х урбанізаванае пакаленне пачало агрэсіўна захопліваць айчынную літаратурную дзялянку. Адбываўся натуральны працэс — здушаная вымушанай стагнацыяй, літаратура вырывалася вонкі, разбураючы межы і ўсё больш парушаючы ўсталяваныя дзесяцігоддзямі правілы гульні.

Пачынаючы з нулявых гадоў новага стагоддзя «традыцыйнасць», «вясковасць» канчаткова зрабіліся маветонам, а рэдкія літаратары, якія насмельваліся пісаць у такім ключы, адразу ж абвінавачваліся крытыкамі ў архаічнасці і ненатуральнасці, а іх творы лічыліся рудыментарнымі і неабавязковымі. Для таго каб супрацьстаяць шквалу непрыняцця і негатыву, захоўваючы пры тым твар, беларускі пісьменнік-традыцыяналіст павінен быў быць альбо вельмі таленавітым, спалучаючы ў сваёй творчасці выкшталцоны адметны стыль з займальнай фабулай, альбо ахвяраваць ідэаламі і пачаць пісаць, падстройваючыся пад крытэрыі «элітарнай тусоўкі». Большасць жа пісьменнікаў-вяскоўцаў сышла ва ўнутраную эміграцыю, аддаліўшыся ад літпрацэсу, бо нішто не забівае натхненне і творчы імпэт так, як адчуванне незапатрабаванасці і марнасці высілкаў.

Упэўнены, што гэтаксама, як цяпер, дзякуючы намаганням асобных апантаных даследчыкаў узнялася хваля цікавасці да спадчыны «маладнякоўцаў» і «узвышанцаў», некалі настане час, калі і творчасць сямідзясятнікаў-васьмідзясятнікаў будзе належным чынам ацэнена і ўганаравана. Прынамсі, некаторыя крокі ўжо робяцца: варта згадаць нядаўні палемічны артыкул Міколы Адама ў «ЛіМе»: «Што і каму павінен пісьменнік», а таксама ягоны літаратуразнаўчы нарыс «Уладзіслаў Рубанаў. Неаднойчы забы(і)ты».

Але ж вёска, як айчынны культурны і літаратурны феномен, нікуды не знікла і знікаць не збіраецца. Як і трыццаць — сорак гадоў таму, гаспадыні выганяюць зрання на пашу кароў, у хлеўчуку рохкае парсюк, а Ганны завіхаюцца каля печы, нават калі пра гэта і не пішуць новыя Мележы. Наадварот, час паказвае, што менавіта вёска — гэта здаровы і надзвычай жыццястойкі арганізм. Раней казалі: калі ты жывеш у вёсцы ці калі ў цябе ёсць сваякі-вяскоўцы, то і ў самыя эканамічна цяжкія часіны не прападзеш. Праецыруючы гэтае меркаванне на літаратуру, можна ўпэўнена сцвярджаць: маючы пісьменніка-вяскоўца, ніводная літаратура не рызыкуе знікнуць ні пры якіх умовах.

Адметна, што вясковая аўтэнтыка робіцца моднай сярод гараджан, сведчаннем гэтаму — усплёск цікавасці да творчасці блогера-даўншыфтара Андруся Горвата, чые таленавітыя нататкі спачатку зрабіліся папулярнымі ў фэйсбучных колах, а выдадзенае пазней «Радзіва "Прудок"» увогуле стала бестселерам.

Аўтар, пра кнігу якога пойдзе сёння гаворка, родам з вёскі Каравацічы Рэчыцкага раёна. Жыццёвы шлях традыцыйны: журфак, праца ў раёнцы. Дэбютаваў як празаік у 2006 годзе на старонках «Звязды» ў конкурсе апавяданняў. Тады ж і атрымаў ад знанага земляка Віктара Казько наступную характарыстыку свайго стылю: «узнёслае пісьмо». І пажаданне-наказ: «… каб на ўсё жыццё хапіла запалу гаваруць прыгожа, шчыра і замілавана».

Цяпер Андрэй Сідарэйка жыве ў Мінску і ў паўсядзённым жыцці займаецца справай, далёкай ад літаратуры. Але ж і пісьменніцтва не кідае: у мінулым годзе выдавецтва «Колорград» выпусціла ў свет зборнік ягонай прозы «Вальс чырвоных гронак рабін». Зборнік названы па аднайменным апавяданні, дарэчы, тым самым, дэбютным, «звяздоўскім». Але ж з таго часу і творчая манера, і ўспрыманне свету маладога творцы прайшлі праз пэўныя этапы трансфармацый, і пра гэта сведчаць іншыя, больш дасканалыя і глыбокія ў мастацкім плане, творы, змешчаныя ў зборніку.

Напачатку варта адзначыць, што «ўзнёсласць», адзначаная Віктарам Казько, саступіла ў творчасці Андрэя Сідарэйкі своеасаблівай лаканічнасці, а непасрэднасць светаадчування набыла рысы таго, што знаўцы літаратуры называюць «знарочыстай наіўнасцю», альбо «наўмыснай спрошчанасцю», што стылёва наблізіла яго прозу да нарвежца Эрленда Лу («Наіўна. Супер», «Пад уладай жанчыны», «Доплер»).

Галоўны герой апавядання «Адзінаццаць хвілін волі» (якім адкрываецца зборнік) аказваецца закладнікам мрой. Ён вымушаны жыць у рэальным свеце і адначасова бачыць у снах іншы, па адчуваннях не менш сапраўдны: рачны, падводны, дзе яму нашмат камфортней, дзе ён сустракае каханую — русалку Дашу. «Што такое свабода?» — разважае ён. І тут жа адказвае: «Свабода ёсць, калі прысутнічае душэўная гармонія». І надыходзіць дзень, калі трэба рабіць канчатковы выбар…

Своеасаблівая «рэальнасць абсурду», праз якую аўтар спрабуе разважаць над філасофскімі пытаннямі, атрымлівае развіццё і ў іншых аповедах, галоўныя героі якіх то пачынаюць разумець мову жывёл («Жыццё змяняецца, прынцыпы застаюцца», «Дзе твой Сусвет?»), то ўступаюць у дыялог з персанажамі ўласных твораў («Бяседа з галоўнымі героямі»).

Наогул, для маладога пісьменніка характэрна імкненне супрацьпаставіць, сутыкнуць рэальнае і ўяўнае, каб на прыкладзе кантрастаў высветліць грані паўсядзённасці. І яму гэта ўдаецца: амаль кожны твор пакідае аб'ёмнае, запамінальнае ўражанне.

Не пазбягае ён і вострых, актуальных тэм, у прыватнасці пытанняў крызісу сямейных адносін, прызначэння творцы, яго месца ў грамадстве. Герой аднаго з апавяданняў прызнаецца: «Аказалася — мой занятак нікога не цікавіў. Ніхто не верыў у мой поспех... Тым больш у кожнага быў свой сусвет і кожны ў гэтым сусвеце існаваў. Штосьці новае нікому не было патрэбным. Штосьці новае значыла адмовіцца ад нечага старога, такога звыклага і дарагога». Праўда, цытата датычыцца іншага хобі — астраноміі, але што такое пісьменніцтва, як таксама не адкрыццё новых сусветаў?

Збянтэжыла апавяданне пад назвай «Заснежаных вішань белая пароша» — сюжэтны і стылёвы «клон» твора, які даў назву кнізе. Бачна, што гэта вучнёўскі твор, перанасычаны банальнасцямі і штампамі. Яго можна было зусім не ўключаць у зборнік. Як і «вясковае» апавяданне «На парозе», пасля прачытання якога ўзнікае трывалае дэжавю, а ўвушшу пачынае гучаць бітлоўскае «*Back in the USSR*» — настолькі аўтар падрабіў, амаль скалькаваў стылёвыя прыёмы савецкіх пісьменнікаў, чыя няшчырасць адчувалася, калі яны скардзіліся на адарванасць ад родных каранёў, адначасова карыстаючыся выгодамі гарадскога жыцця.

А вось аповед «Велікодны пачастунак» — прыклад шыкоўна выпісанага настальгічнага ўспаміну пра дзяцінства, у якім шмат хто з вяскоўцаў пазнае ўласнае маленства, вельмі лірычная, пастральцоўску настраёвая рэч.

Пэўную долю нараканняў можа выклікаць і мастацкае аздабленне кнігі, выкананае калі не на аматарскім, то прынамсі на паўпрафесійным узроўні. Вокладка аляпаватая, перанасычаная фарбамі, фотаздымкі-ілюстрацыі да твораў наўпростава-прымітыўныя. Засмуцілі і прапушчаныя карэктарам абдрукоўкі, якія раз-пораз трапляюцца ў тэксце, гэтаксама як і стылёвыя хібы. Дробязі, але непрыемна.

Цёзка аўтара гэтай кнігі вядомы беларускі празаік Андрэй Федарэнка на прыкладзе сваёй творчасці даказаў (і працягвае даказваць), што падзел пісьменнікаў на традыцыяналістаў і наватараў — справа няўдзячная, бо сапраўдная літаратура — не «вясковая» і не «гарадская», а агульначалавечая. У рэшце рэшт усё ўпіраецца ў талент асобна ўзятага творцы. У Андрэя Сідарэйкі гэты талент ёсць. Ёсць і над чым працаваць, што ўдасканальваць. Але галоўнае — ён развіваецца, працуе над стылем, намацвае сваю адметную сцяжыну, якая, спадзяёмся, неўзабаве выведзе яго «на шырокі прастор».

Янка ЛАЙКОЎ

водгулле

Прага самавызначэння

З расповеду пра яе і пачынаецца аповесць «Нікуды» Віктара Казько, надрукаваная ў першым нумары «Нёмана». «Я, белорус, нищ, безгласен и гол» — вось так апісвае сябе галоўны герой. Калі ёсць дарогі, яны некуды вядуць, таму галоўны герой захацеў зведаць іх, і жаданне з'явілася з ніадкуль, затрымаўшыся на ўсё жыццё. Можна растлумачыць яго толькі адным — жаданнем адчуваць плынь жыцця. Да таго ж герой заўсёды марыў аб чымсьці нязведаным, новым, нават калі б гэта магло каштаваць яму жыцця.

Да пары нават не зусім ясна, у які час адбываюцца падзеі, бо роздумы героя перагукаюцца ў часе і прасторы. Адзінае, што акрэсліваецца дакладна, — маці і сястрычка памерлі, а бацька мае іншую сям'ю. Таму, толькі пасля прачытання ледзь не трэці аповесці, пачынаеш разумець сюжэт, бо кальцавая кампазіцыя з элементамі праспекцыі і рэтраспекцыі (у большай ступені) не дазваляе бегчы па творы. Увесь аповед героя будуецца на яго дзяцінстве, тым, што не помніў, і тым, што ўсплывае ў памяці. Ён успамінае кожную смерць побач з сабой і кожны шанц жыць, які даваў яму лёс. Усё гэта магла б сцерці памяць. Але менавіта яна і кантралюе жыццё і лёс. У рэшце рэшт усе мы застаёмся дзецьмі нават у 70 гадоў, упэўнены аўтар.

Мэта героя — прасачыць за сабой, знайсці сябе на Азарыцка-Даманавіцкім гасцінцы, які з'яўляецца ключавым сімвалам твора. Сюжэтна ён сустракаецца не раз: калі малым яшчэ хлопчыкам прыбіўся да вязняў канцлагера, калі бабуля яго забірае ледзь жывога адтуль, калі, прагнучы дарогі і не жадаючы заставацца, ён сыходзіць з дома, але вяртаецца цёмнай ноччу, калі ўжо старым шукае сваіх родных на могілках, што раскінуліся па розныя бакі гэтага шляху… І нават цяпер невядома, як бы змянілася жыццё, выберы герой іншы шлях.

Што ў пачатку можа ўбачыць чытач, які жадае інтрыгі і хуткіх падзей? Нязначныя доўгія апісанні і разважанні. Што ўбачыць больш удумлівы чытач? Дакладнасць вобразаў і сімвалаў, якія ўплываюць на асобу ўражлівага і чуллівага хлопчыка ці падлетка, які марыць аб жыцці ва ўсіх яго праявах жорсткасці і мяккасці. А вобразы вельмі яркія і непаўторныя, урэзваюцца ў памяць дзякуючы метафарам. Дамы вёскі, якую бачыць герой больш чым праз паўстагоддзя, ён параўноўвае з непахаванымі людзьмі, якія ператварыліся ў мумії, ці пакойніцы-хаты; а смерць маці, якую параніла падчас вайны кавалкам снарада на печы, — з палётам.

Галоўная ідэя аўтара сканцэнтравана на некалькіх апошніх старонках аповесці, дзе ён сцвярджае: «Так, по своему желанию и хотению, подобно Емеле, памяркоўна, по-белорусски, мы самоуничтожаемся в мире, вселенной и в своем родном доме. По-живому рвем пуповину, связывающую нас с нашими предками, космосом, будущим — с наследниками, своим родоводом». Менавіта тут герой самавызначыўся, павандраваўшы па свеце і вярнуўшыся ў вёску дзяцінства. Менавіта тут аўтар падпісвае прыгавор беларусам, віна якіх, галоўным чынам, — у забыцці свайго роднага кутка, сваіх родных, што нават з памяці сыходзяць, а на магілах застаюцца цяжэзныя мармуровыя пліты, якімі нібы адкупляюцца.

Найбольш цікава будзе чытаць аповесць тым, хто не ведае біяграфіі Віктара Казько. Менавіта ў такім парадку можна было б пазнаёміцца з жыццём і творчасцю пісьменніка, калі не адбылося раней. Магчыма, так было б больш правільна ацаніць гэты твор, бо ён мае пад сабой дакладную факталагічную аснову.

Яўгенія ШЫЦЬКА

мастацкія практыкі

Алена РУСАКЕВІЧ

КАЛАЖ: ЛІБЕРАЛЬНАЯ ТЭХНІКА, НЕДААЦЭНЕНЫ КІРУНАК

Назіраючы за творчасцю сучасных айчынных аўтараў, цяжка не звярнуць увагу на іх творы, выкананыя ў тэхніцы калажу. Сучасныя мастакі ствараюць калажы на розныя тэмы, эксперыментуюць з кампазіцыяй і каларытам, гэтыя творы адрозніваюцца нестандартнай формай, напоўненыя глыбокім ідэйным зместам, за кошт чаго прыцягваюць увагу. Усё гэта дазваляе сцвярджаць, што калаж сёння стаў адной з самых актуальных формаў сучаснага мастацтва.

Калаж як самастойная тэхніка вылучыўся ў эпоху мадэрнізму. Фармальныя пошукі мастакоў XX стагоддзя паспрыялі пераасэнсаванню і развіццю тэхнікі. У гэты перыяд калаж ператварыўся ў выклік традыцыйнаму мастацтву. Прыклейванне розных аб'ектаў на плоскасць стала адным з метадаў сцвярджэння новага мастацтва. Менавіта ў гэты перыяд калаж набыў статус адыёзнага і нетрывіяльнага спосабу адлюстравання рэчаіснасці.

Пачынаючы з 60-х гг. XX стагоддзя з гульні з формай і спосабу пратэсту калаж ператварыўся ў гульню з вобразамі і сэнсамі. Выразаныя дэталі, адмыслова скампанаваныя на плоскасці, набываюць новае гучанне і становяцца самастойным творам мастацтва. Кожны мастак падпарадкоўвае іх сваёй логіцы і аўтарскаму стылю, што дазваляе ствараць унікальныя творы, якія адрозніваюцца ўласнай мастацкай мовай і аўтарскай задумай.

У сучасным мастацтве, якое заснавана на прынцыпе адаптацыі гатовых вобразаў у асобным творы мастацтва, калаж можа па праве лічыцца самай арганічнай формай выяўленчага мастацтва. Больш за тое, разнастайнасць мастацкіх прыёмаў і творчых падыходаў у гэтай тэхніцы сёння дазваляе лічыць калаж адной з самых ліберальных тэхнік у выяўленчым мастацтве: сродкі мастацкай выразнасці тут змяняюцца ў залежнасці ад стылявога напрамку і творчай мовы кожнага асобнага аўтара.

Сучасныя беларускія мастакі актыўна выкарыстоўваюць тэхніку калажу ў сваёй творчасці. Тым не менш варта адзначыць, што калаж усё яшчэ недаацэнены ў поўнай меры сучаснымі айчыннымі аўтарамі, і, на жаль, складана знайсці мастака, які займаўся б выключна стварэннем калажу. Збольшага гэта звязана з тым, што часам ён набывае толькі прыкладную функцыю. Напрыклад, ствараючы эскізы да будучых твораў, мастакі прыклейваюць на аснову разнастайныя па форме, колеры і фактуры модулі, што дазваляе ў поўнай меры эксперыментаваць з фактурамі і формамі. Такі падыход часам фарміруе ў мастакоў крыху прадузятае альбо нават негатыўнае стаўленне да гэтай тэхнікі, якая патрабуе як быццам меншых намаганняў і ўменняў. Па гэтай прычыне многія, нават самыя таленавітыя і паспяховыя мастакі не разглядаюць усур'ёз магчымасці дэманстраваць публіцы свае калажы (нягледзячы на тое, што нават іх эскізы, выкананыя ў гэтай тэхніцы, нярэдка маюць высокую мастацкую каштоўнасць).

Нягледзячы на ўсе за і супраць, калаж варты ўвагі і мае права лічыцца адной з самых высакародных тэхнік у сучасным выяўленчым мастацтве. Бо менавіта ён адпавядае патрабаванням мастацтва постмадэрнізму.

Эмацыянальныя імправізацыі

ў фотаработах Міхаіла Баразны

Разважаючы над творчасцю мастака Міхаіла Баразны, заўсёды ўспамінаеш яго жывапіс, насычаны геаметрычнымі канструкцыямі і вострай драматургіяй. Але ж акрамя жывапісу мастак шмат гадоў займаецца фотамастацтвам, якое дае яму задавальненне не меншае, чым іншыя напрамкі творчасці. Зараз у мастацкай галерэі «Арт-Беларусь» экспануецца фотавыстаўка майстра «Інтэнцыі», праз якую праглядаецца ўнутранае захапленне аўтара візуальнай эстэтыкай наваколля, людзьмі, дробнымі альбо ўвогуле непрыкметнымі дэталямі.

У адзінай экспазіцыйнай прасторы глядач можа ўбачыць фрагменты фатаграфічных эксперыментаў Міхаіла Баразны розных гадоў.

— Мне падабаецца трымаць камеру ў руках. Разумееце, ёсць пэўнае чараўніцтва ў гэтым працэсе, — тлумачыць Міхаіл Баразна. — Ты той жа мастак, толькі для стварэння работы не трэба чакаць натхнення, тут больш трэба сканцэнтравацца на імпульсе, быць уважлівым — быццам выходзіш на паляванне. Напэўна, займацца толькі фатаграфіяй я б доўга не змог, але ж у сінтэзе з іншымі напрамкамі яна дапамагае раскрываць розныя ўнутраныя грані і магчымасці.

Свае выстаўкі Міхаіл Баразна часта называе мастацтвазнаўчымі фотапраектамі. Большасць праектаў і серый маюць значную працягласць па часе папаўнення, асобныя не завершаныя і сёння. Мастак ілюструе эмацыянальныя характарыстыкі наваколля і лічыць важнай якасцю ўменне іх заўважаць. Творца ўспрымае фотакамеру найбольш зручным і даступным, але далёка не ідэальным інструментам для сучаснага аўтара: у эпоху тэхналогій з'явілася шмат гаджэтаў, камеры якіх па якасці не саступаюць лепшай фотатэхніцы. Таму захапленне фотамастацтвам сёння і ёсць унутраная эстэтыка, тое самае высакароднае пачуццё, якое дазваляе адчуць фатаграфію як паўнавартасны від мастацтва.

Паколькі на выстаўцы прадстаўлены работы розных перыядаў, можа падацца, што агульная карціна экспазіцыі не складзецца, аднак яна захоўвае цэласнасць, што дэманструе рэжысёрскае майстэрства аўтара. Ёсць адчуванне, што ўсёй выстаўцы заданая пэўная танальнасць, якая можа мяняць тэмп: ад дынамічнага да больш павольнага.

У большасці фотаработ Міхаіла Баразны пануе засяроджана-сузіральны дух, надзелены эмацыянальнай імправізацыяй. Разам з тым каляровая лёгкасць можа пераходзіць у цалкам ірэальную аўру, дзе дамінуе наўмысная незавершанасць.

Дарэчы, зыбкія зоны пустэчы робяць некаторыя фатаграфіі падобнымі да беспрадметнага жывапісу, як, напрыклад, у здымках «Жнівень», «Мінск», «Вуліца Навуковая». У пэўных работах праглядаюцца больш цёмныя тоны, галоўная роля чорнаму колеру, які прыўносіць больш драматычнага эфекту («Зачыненыя дзверы», «Рым»). Погляд на пэўныя падзеі ў Міхаіла Баразны часта выліваецца ў гратэск і іронію («Тайная вячэра», «Ружовая прастора»). А водныя раўніны, сонечныя прамяні, тэкстуры старых муроў — усё гэта часта чапляе вока мастака. Па меркаванні аўтара, гэтыя элементы прыроднай прыгажосці ствараюць для гледача пляцоўку інтэлектуальных разваг.

«Поле», 2016 г.

Па характары мастаку ўласцівая сістэматызацыя. Ён умее рацыяналізаваць ірацыянальнае, а эмацыянальныя рухі і спакойны настрой адначасова змяшчае ў акрэсленыя рамкі.

Насамрэч у фатаграфіях Міхаіла Баразны заўважна мноства адсылак да жывапіснага кірунку. Творца імкнецца сумясціць фатаграфічнасць з мастацкай палітрай. На яго работы можна глядзець доўга, бо яны дыялагічныя і дапамагаюць не проста знайсці адказы на пытанні, але і фарміруюць унутранае пачуцце гармоніі, якое, бывае, так складана адчуць у штодзённасці.

Вікторыя АСКЕРА

ДЫНАСТЫЯ: МАСЛЕНІКАВЫ

Усе мастакі дынастыі Масленікавых сваю творчасць прысвячаюць роднай Беларусі, апяваючы яе веліч і прыгажосць. Пра гэта сведчыць іх «Сямейны альбом» — выстаўка, якая праходзіць у Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі і прымеркаваная да 105-годдзя народнага мастака Беларусі Паўла Масленікава.

Прадстаўлены палотны трох пакаленняў мастакоў, але цэнтральную пазіцыю займаюць творы заснавальніка дынастыі — Паўла Васільевіча. Ён ствараў каларытныя беларускія краявіды, працаваў мастаком-пастаноўшчыкам у Тэатры оперы і балета, афармляў спектаклі ў Купалаўскім. Любоў да прыроды Павел Васільевіч перадаў сыну Уладзіміру, цяпер загадчыку кафедры жывапісу Акадэміі мастацтваў Беларусі. З дзяцінства Уладзімір з бацькам ездзіў на эцюды. Падобныя практыкі дазволілі будучаму мастаку дасканала вывучыць прыроду роднай зямлі, яе непаўторныя асаблівасці і каларыт, што знайшло адлюстраванне на палотнах. Лёгка і нязмушана мастак стварае поўныя святла і паветра панарамы і пейзажы. З цікавасцю Уладзімір ставіцца і да партрэта, у які пераносіць эмацыянальны зарад прыродных сіл, надзяляючы герояў пазітыўнай энергетыкай.

Унук заснавальніка дынастыі Павел, як і яго бацька, з самага дзяцінства далучаўся да сямейных традыцый. Пасталеўшы, шукаў свой стыль, у якім ёсць сінтэз экспрэсіўнай эцюднай манеры, характэрнай для дзеда, і строгай кампазіцыі, выразнага малюнка, прапрацоўкі дэталяў, уласцівых бацьку.

— Тут не проста нашы творы альбо краявіды Беларусі, тут жыццё нашай сям'і, бо жыццё для нас і ёсць мастацтва, — дзеліцца Павел Масленікаў. — Усе прадстаўленыя творы — з нашага сямейнага архіва. Тут вялікая частка работ, якія ўвогуле не выстаўляліся. Мы іх адмыслова аформілі да гэтай выстаўкі, каб убачылі рознага і арыгінальнага Паўла Васільевіча Масленікава. І нашы з татам творы практычна ўсе новыя. Спадзяюся, што выстаўка будзе не проста пэўнай рэтраспектывай, але і глебай для аналізу творчага развіцця.

У межах экспазіцыі заўважна, наколькі адрозніваюцца работы трох аўтараў. Але існуе агульная тэма як асноўны складнік іх творчай сувязі.

— Мы бачым, як людзі пранікаюцца прыгажосцю і любоўю да радзімы, якая была ў душы Паўла Васільевіча. Яго творы — магутная спадчына, якой можа ганарыцца Беларусь, — падкрэслівае дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Павел Сапоцька.

У юбілейны год нашчадкі дынастыі зробяць падарунак 75-й гімназіі імя Паўла Масленікава ў Мінску: перададуць дзве арыгінальныя работы беларускага пейзажыста.

Вікторыя АСКЕРА



Работа Паўла Васільевіча Масленікава.

АБАГАЎЛЁНЫЯ СТАСУНКІ

Мужчынскае і жаночае ў «Песні песняў» Юры Дзівакова

У межах праекта «ТОК» ад *ART CORPORATION* у культурным хабе ОК16 на пачатку года Юра Дзівакоў паставіў новы спектакль. Што ён зрабіў гэтым разам?

Юра Дзівакоў стварыў спектаклі «Войцэк» у Нацыянальным акадэмічным тэатры Янкі Купалы, «*OEDIPUS*» у Гомельскім моладзевым тэатры, «Крыжовыпаходдзяцей» у тым жа ОК16. І гэтым разам можна казаць, што «Песня песняў» — стылістычны і тэматычны набор, складзены з папярэдніх спектакляў.

«Песню песняў» Саламона звычайна інтэрпрэтуюць як тое, што адбываецца паміж чалавекам і Богам. Нюансы паводле розных рэлігій, у кантэксце якіх інтэрпрэтуюць твор, вагаюцца, але сутнасць застаецца адна і тая ж: гэта тэкст, які кажа не пра плоцевае, а пра духоўнае. У шматвяковай культурнай традыцыі выпрацаваны рэфлекс дадаваць да гэтага тэксту, напоўненага пачуццёвым і цялесным, інтэрпрэтацыю стасункаў чалавечага і боскага. Гэта можа датычыцца і «Песні песняў» Юры Дзівакова, і, як ні дзіўна, пры максімальнай фетышызацыі цела ў яго спектаклях у ОК16.

«Крыжовыпаходдзяцей» і «Песня песняў» аб'яднаныя не толькі адной прасторай, але і мастаком (Таня Дзівакова), кампазітарам (Эрык Арлоў-Шымкус) і відэамастаком (Дзіна Даніловіч). І я б аб'яднала два гэтыя спектаклі ў дыптых — па іх эстэтыцы і паводле гульні па адных і тых жа правілах кантрастаў і натуральнага эпатажу.

«Песня песняў» як і «Крыжовыпаходдзяцей» пабудаваны на кантрасце. І калі ў папярэднім спектаклі яго трэба шукаць у назвах частак і рэалізацыі, у дэталях інтэрпрэтацыі голаду і неўтаймаванага спажывання, то ў «Песні песняў» ён яшчэ больш зразумелы і просты: сучасная агрэсіўная чытка тэксту, якая чаргуецца з царкоўнымі спевамі, пакора і агрэсія, аголенае цела і накінутае на яго футра, узнёсла прачытанае на сцэне «я буду п*****ць цябе» з класічнымі скульптурамі за спінамі. І на фоне гэтай палярнасці адбываецца сціранне бінарнай сістэмы паміж мужчынскім і жаночым. У арыгінальным тэксце не пазначана відавочных межаў паміж партыямі двух (альбо трох — тут крыніцы разыходзяцца) герояў, таму месцамі цяжка вызначыць, ад чыйго імя ідзе тэкст. І рэжысёр гэтым карыстаецца, робіць пазначаную ў тэксце расплывістасць яшчэ больш вызначынай — руйнуе мяжу жаночай і мужчынскай партыі (жаночыя партыі выконвае Эльдар Бекір, а мужчынскія — Марта Голубева). Пазбаўленне межаў таксама рэалізоўваецца праз візуальны складнік: яркі акцэнт на мужчынскім макіяжы, аднолькавыя футры зверху — і на жаночым, і на мужчынскім целе. І тут жа за тэкстам гучыць маналог пра сексуальнасць і рознасць (ці аднолькавасць) гутаркі пра яе для розных людзей.

«Песню песняў» можна назваць моноспектаклем, дзе галоўную і адзіную ролю выконвае Марта Голубева, а Эльдар Бекір становіцца часткай сцэнаграфіі, якая падаецца праз экран. Але я б прапанавала не называць, таму што тут становіцца раўназначным тое, што мы бачым на экране, і тое, што адбываецца на рэальнай сцэне. Са спектакля немагчыма выключыць мультымедыйную частку без страты сэнсу: без мультымедыя гэты спектакль не існуе. І менавіта з дапамогай экрана за спінай галоўнай гераіні мужчынская постаць перасоўваецца на другі план, а жаночая застаецца ў цэнтры. І яна — цэнтр сусвету на 40 хвілін. Няварта забываць, пра тое, што спектаклі Юры Дзівакова напоўненыя сацыяльнай праблематыкай падчас іх інтэрпрэтацый, гэта адна з прывабных для гледача частак, якая дапамагае збіраць поўныя залы. І акцэнт на цялесным каханні ссоўвае яго ў сферу сям'і і шлюбу, у гендарную праблематыку. І тут ён ставіць на першы план жанчыну, пакідаючы для мужчыны экран — гэта пра сучасны кантэкст, у якім жанчына перасоўваецца з месца аб'екта на месца суб'екта.

Калі асобна казаць пра сцэнаграфію як пра свет прадметаў, у якіх існуюць героі, то яна скупая, але ў той жа час не столькі

Фота Ганны Шарко.

Сцэна са спектакля «Песня песняў».

функцыянальная, колькі атрыбутная. Акварыумы з мужчынскімі рэчамі справа і жаночымі рэчамі злева існуюць на сцэне як сімвалы герметызацыі мужчынскага і жаночага, паміж якімі на сцене феміннасць і маскуліннасць у дзеянні пераплятаюцца і цыркулююць, увасобленыя ў два целы. Два сэрцы — мужчынскае і жаночае, — якія на сваіх плячах цягне толькі жанчына, матэрыялізуюць існуючае ў грамадстве «я буду кахаць за дваіх». І, вядома ж, нельга абысці ўвагай крывавую кропельніцу над сталом — як сімвал пастаяннага болю на працягу ўсяго спектакля.

У анатацыі гучаць прыгожыя словы пра стан любові, рамантычнае каханне і прыгажосць. Але тут разгортваецца патрабаванне любові — гвалтоўнае ў агрэсіўнай трансляцыі тэксту, якое прыносіць боль, ад якой капае кроў на стол і выломвае цела жанчыны. Але каханне — гэта добра, гэта радасць, таму яго трэба хацець: патрабаваць, калі не атрымліваеш, гвалтаваць сваёй прагай кахання, калі яе табе не даюць. І гераіня праходзіць пакуты і прымус іншага чалавека дзеля фінальнай сцэны на стале: гвалтуючы сябе, яна гвалтуе свойго партнёра, каб памерці, каб выкласці перад ім свае вантробы. Юра Дзівакоў на сцене стварае крытыку на ўнармаванасць у грамадстве патрабаванняў, якія датычацца стасункаў паміж двума людзьмі. Прымус унармаванасці, уціскание ў межы таксама можа быць гвалтоўным.

«Песня песняў» Юры Дзівакова — гэта не пра каханне жанчыны і мужчыны, а пра абагаўленне намі кахання, стасункаў і сям'і, якія будуюцца на (не)каханні. Ці каханне гэта, калі так хваравіта і балюча? Ці каштуе тое, што мы самастойна абагаўляем, такога болю? «Песня песняў» Юры Дзівакова — спектакль з крытыкай сучаснага ўяўлення пра нарматыўнасць. Эксцэнтрычны, але зусім зразумелы, калі не шакуе эпатажная шырма з крыку ў акцёрскім выкананні, кроў у сцэнаграфіі і адсутнасць касцюма на аголеным целе.

Святлана КУРГАНАВА

Рэфарматарам у спадчыну

XXVI Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш стала своеасаблівым феерверкам на фоне страты цікавасці да пісьмовых тэкстаў і кніг як такіх. Тут кожны наведвальнік мог знайсці сваё…

Знайшла і я сваю кнігу і сваю прэзентацыю, хоць кніг пра тэатр практычна не было ў беларускіх павільёнах. Яны, гэтыя кнігі, вельмі нешматлікія, аказаліся ў расійскім павільёне. Не магу не падзяліцца захапленнем ад зносін з выдатным тэатразнаўцам з Масквы Рымай Паўлаўнай Крэчатавай. Яна з выдавецтвам «Молодая гвардия» прэзентавала сваю работу ў серыі «Жыццё знакамітых людзей». Кніга называецца проста: «Станіслаўскі». Аднак гэта не біяграфія вялікага для ўсяго сусветнага тэатра чалавека. Любы біёграф, вывучаючы жыццё тэатра, сутыкаецца тым, што напісалі, часам прысачынілі, не так зразумелі яго папярэднікі. Чалавека даўно няма. Няма і яго спектакляў. Яшчэ застаецца жывая памяць пра ўбачанае, аднак і яна бывае суб'ектыўнай, і герой біяграфічнай кнігі атрымліваецца зусім не такі, які быў на самай справе.

Кніга Крэчатавай адрозніваецца ад усіх папярэдніх даследаванняў і твораў, а іх было нямала. Гэта шматтомныя працы І. Вінаградскай, П. Макарава, Е. Паляковай, І. Салаўёвай, М. Страявой, В. Тапаркова, ды і самога Канстанціна Сяргеевіча Станіслаўскага. З вялікай павагай Крэчатава вылучае наватарскі трохтомнік Вольгі Аляксандраўны Радзішчавай «Станіслаўскі і Неміровіч-Данчанка. Гісторыя тэатральных стасункаў». Радзішчава займалася сістэматызацыяй архіва Станіслаўскага ў Музеі Мастацкага тэатра і больш за іншых дакранулася да крыніц. Следам за ёю Рыма Крэчатава прапануе прынцыпова іншы ракурс погляду на асобу Станіслаўскага, на яго сістэму, на МХАТ. Праз асобныя дакументы аўтар паказвае тое, што не ўвайшло ў хрэстаматыі. Па-першае, гэта Вялікі Тэатральны Час нараджэння першых крокаў рэжысёрскага тэатра. Падругое, развянчанне сумніўных легенд і недарэчных выдумак пра асобу рэфарматара тэатра. Па-трэцяе, узбуджэнне цікавасці да чытання дзевяці тамоў збору твораў Станіслаўскага. Яны захаваліся, але мала хто з тэатральных людзей у іх зазірае.

Новыя ідэі і новая інфармацыя, што захліснулі сёння тэатр, ціск новых відаў і формаў мастацтва прытушылі цікавасць да псіхалагічнага тэатра, да майстэрства пераўвасаблення, якім быў моцны тэатр пачатку XX стагоддзя. Фармальнае стаўленне да іх дазволіла тлумачыць сістэму Станіслаўскага як набор пэўных дзеянняў і, што казаць, скампраметавала яе. Хто сёння памятае аб этычных прынцыпах, якія, як сцвярджаў Канстанцін Сяргеевіч, цалкам неабходныя ў тэатры?! Затое студэнтам тэатральных ВНУ, напэўна, распавядуць пра дрэнны характар старога, пра канфлікты з артыстамі. І не ўспомняць пра інтэлігентнасць, адукаванасць і тэатральны інстынкт Станіслаўскага.

Ці трэба сёння пра ўсё гэта ўспамінаць? Думаю, проста неабходна. Наш сённяшні тэатр змяняецца да непазнавальнасці. Ён становіцца ўсё больш відовішчны. Яму становіцца нецікава слова, а следам і сэнс таго, што гаворыцца са сцэны. Старэйшае пакаленне тэатральных людзей яшчэ спрабуе супраціўляцца і казаць пра «жыццё чалавечага духу». Маладыя рэфарматары смяюцца з іх і, забыўшыся пра дух, усё больш разнастайна апяваюць цела. Кнізе пра Станіслаўскага дапамаглі з'явіцца на свет бібліятэкі СТД Расіі, Музей МХАТ, тэатральны музей імя А. Бахрушына. Дарэчы, выданні бахрушынскага музея былі шырока прадстаўлены на цяперашняй кніжкай выстаўцы і выклікалі натуральную зайздрасць і смутак, што нічога падобнага не з'яўляецца пра тэатр у Беларусі.



І яшчэ. Крэчатава і сама тэатральная легенда. Яе артыкулы літаральна падрывалі тэатральную цішыню. Яна чалавек вельмі немалады. За яе творчасць ухапілася выдавецтва «Маладая гвардыя» і палічыла, што кніга пра Станіслаўскага павінна прызначацца маладому пакаленню. Хоць, калі шчыра, я лічу, што пакаленне — гэта не ўзрост. Гэта пэўныя каштоўнасці. Вялікая спадчына рэфарматараў тэатра XX стагоддзя цалкам можа быць каштоўнасцю для рэфарматараў тэатра нашага XXI стагоддзя. Як хацелася б, каб складанай наватарскай даследчыцкай работай Крэчатавай «Станіслаўскі» зацікавіліся нашы педагогі, рэжысёры і артысты. Наклад у 5000 асобнікаў гэта зрабіць дазваляе.

Таццяна АРЛОВА

Дзесяць адценняў сапраўднага

ў дакументальных фільмах «Летапісу»

Мы жывём у свеце, дзе іграваe кіно не займае ключавыя пазіцыі ў чалавечым экранным каляндарыку. Не апошняй часткай гэтага дамінавання з'яўляецца няспынны поспех стужак у жанры «супергероікі» — і гэта надае агульнай трансляцыі нерэальнасці лёгкія адценні эскапізму. Але, што куды больш важна, гэта ўплывае на наша светаўспрыманне, стаўленне да лжы і праўды. Іграваe кіно працуе з масавым гледачом і спрацоўвае за кошт прадуманага перашчоўквання тумблераў са стэрэатыпамі, архетыпамі і іншымі тыпамі. Такім чынам, карцінка ў большасці атрымліваецца ўсярэдненай, пластыкавай, нерэальнай (хаця і яскрава-рознакаляровай). Тое, што ўбачылі ў кінатэатры, гледачы пераносяць на ўласны побыт, таму наступныя фільмы, калі не робяцца па абстрактных сцэнарна-рэжысёрскіх лякалах, атрымліваюцца яшчэ больш далёкімі ад рэальнасці.

Па другі бок кінапраўдзівасці стаіць дакументалістыка: больш сціплая ў мастацкіх сродках, але больш шчодрая на факты і жывых людзей. Але нават у такой, здавалася б, максімальна рэалістычнай формы кінамастацтва шлях да сапраўднага жыцця можа быць цярністы: матывы стварэння карціны, індывідуальнае рэжысёрскае бачанне ці асобныя мастацкія сродкі — усё гэта можа як прывесці дакументальны фільм ледзь не да натуралізму, так і нябачна зблізіць яго з іграваым. Падраздзяленне «Беларусьфільма» кінастудыя «Летапіс» добра разумее наяўнасць гэтага шырокага спектра праўдаперадачы і ў 2018 годзе выпраменьвала шэраг адценняў гэтага спектра.

АДЦЕННЕ I. «НАВУКА НА ВАРЦЕ ЗАКОНА»

Што атрымліваецца, калі да стварэння фільма прыводзіць заказ? Ён становіцца падобны да рэпартажу навін, дзе, як ва ўзорнай навуковай рабоце, зробленай першакурснікам, строга распавядаецца гісторыя з'явы, яе намінальна-слоўнікавыя асаблівасці і (абавязкова!) мора-мора-акіян усялякіх лічбаў з гаворкай пра тое, як усё гэта можа як прывесці дакументальны фільм ледзь не да натуралізму, так і нябачна зблізіць яго з іграваым. Падраздзяленне «Беларусьфільма» кінастудыя «Летапіс» добра разумее наяўнасць гэтага шырокага спектра праўдаперадачы і ў 2018 годзе выпраменьвала шэраг адценняў гэтага спектра.

АДЦЕННЕ II. «GENERATION PLAY»

Адказ на папярэднюю задачку нечакана нашмат бліжэйшы, чым магло падацца. Усё той жа Ігар Чышчэня, беручыся за тэму *IT*, адчувае сябе куды больш утульна. У фільме дзве сюжэтныя лініі, адна з якіх — пра выкарыстанне *VR*-тэхналогій у медыцынскіх мэтах, другая ж — пра дзіцячыя тэхналагічныя курсы ў Палацы дзяцей і моладзі. Праз пакаленні сталых дэвелапераў і сучасных дзяцей рэжысёр з дапамогай даволі рванага мантажу даносіць ідэю таго, што агульная камп'ютарызацыя свету ўжо ўкаранілася ў нашым побыце і падкрэслівае гэтую думку шчырай сцэнай таго, як дзеці ў двары ўяўляць, быццам яны — героі камп'ютарнай гульні (з характэрнымі слэнгавымі тэрмінамі і паводзінамі). Так Чышчэня гаворыць пра тое, што ягонае, сучаснае Джэнэрэйшн П, па-першае, ад слова «плэй» («гуляць»), а па-другое, зрабіла гульню не толькі баўленнем часу, але і паўнавартасным і ўкаранелым светаўспрыманнем.

АДЦЕННЕ III. «ЗЯМЛЯК»

У фільме пра трэцяга беларуса-касманаўта Алега Навіцкага той жа рэжысёр, што некалі быў аператарам у стужках пра першых двух беларусаў-касманаўтаў. Здаецца, гэта павінна было зрабіць з Анатоля Алая паслядоўніка добрых традыцый, але не ўсё так проста. Стандартныя піксяляшчыя літары ў назве фільма і знаёмыя па іншых стужках «Беларусьфільма» капеечныя зорныя «заднікі» не сведчаць аб прагрэсе па частцы выкарыстання тэхналогій падчас работы. Не самым удалым чынам выкарыстана інтэрв'ю: амаль ва ўсіх тых момантах, калі з боку камеры гучыць пытанне-падводка, герой адказвае паўжартам і сцісла. Гэта, можна падумаць, было зроблена для выбудовы больш цеснай эмацыянальнай сувязі паміж рэжысёрам, героем і глядачом, але падобныя моманты могуць выклікаць усмешку. І пры гэтым кадры са слязамі маці галоўнага героя, якія з'яўляюцца ў непрадказальныя моманты, быццам наўмысна выціскаюць эмоцыі з-за цяжкага касманаўцкага лёсу…

АДЦЕННЕ IV. «ІНКЛЮЗІЯ»

Стужкі пра дзяцей з асаблівасцямі развіцця заўсёды трымаюцца на тых героях (ва ўсіх значэннях), што даглядяюць гэтых дзяцей. Калі героі харызматычныя і з моцным унутраным стрыжнем, спрацоўвае як узор для пераймання. Але ў гэтай карціне рэжысёру Аляксандры Маркавай удалося перадаць не толькі пазіцыю дарослых, але і мары саміх дзяцей. Найбольш яскрава гэта адлюстравана ў сюжэце з дзяўчынкай, якая жадае стаць акцёркай. Паміж ёй і маці падчас навядзення сур'ёзнага мэйк-апу атрымліваецца дыялог пра пазашкольныя перспектывы, дзе дачка, разумеючы, як ёй будзе складана, дзеліцца сваімі планамі. Пазней маці працягвае рабіць дачцэ макіяж і даносіць на камеру свае думкі пра складанасці, звязаныя з атрыманнем адукацыі для людзей з асаблівасцямі развіцця…

АДЦЕННЕ V. «ПОЛАЦКІ ВАЛЬС»

Пра галоўных герояў, падобных герою гэтага фільма, гаворыць «першы хлопец на вёсцы». Самадзейны кампазітар і мастацкі кіраўнік Васіль ходзіць да бабуль і маладзейшых жанчын свайго населенага пункта, імправізацыйна сачыняе да іх словаў аранжыроўкі і ўдзельнічае з імі на лакальных мерапрыемствах — і ўсё гэта з характэрным правінцыйным (і адначасова інтэлігентным) характарам і гумарам. Асобнай падзякі рэжысёр Вольга Дашук заслугоўвае за фіксацыю таго моманту, калі Васіль рэдагуе дасланы з Полацка тэкст песні. Такі дакладны злепак з творчага працэсу далёка не кожны рэжысёр у іграваым кіно адлюструе. А тут — атрымалася.

АДЦЕННЕ VI. «ЛЕХАЙМ! ЗА ЖЫЦЦЁ!»

Паказаць Вялікую Айчынную так, як дагэтуль не рабілі, з кожным годам усё цяжэй і цяжэй, але Тамара Вяршыцкая ведае сваю справу і робіць чарговае кіно на гэтую тэму цікавым з дапамогай трох момантаў. Па-першае, бярэ вельмі вузкую гістарычную падзею — пабег яўрэяў з навагрудскага гета і далейшае фарміраванне партызанскага атрада. Па-другое, выкарыстоўвае пастановачныя фрагменты самога пабегу, якія перамяжоўваюцца са здымкамі рэальнай тэрыторыі гета, якое стала музеем. Трэці момант самы дзейсны і шчымлівы: размовы нашчадкаў, якія падчас фільма ўпершыню пабывалі ў гэтым гета-музеі, а некаторыя нават упершыню даведаліся, што іх продкі адтуль уцякалі.

АДЦЕННЕ VII. «ВЯЛІКАЕ ПАДАРОЖЖА КНЯЗА МІКАЛАЯ ХРЫСТАФОРА РАДЗІВІЛА СІРОТКІ»

Вельмі крэатыўны і нечаканы пачатак гэтага фільма выскрабае з паджылак усю глядацкую мужнасць. Камера выглядвае знутры труны, якую адкрывае чалавек у белай масцы з яркім ліхтарыкам, а тым часам спачынліва-спакойны голас гаворыць пра сваё абуджэнне і падзывае да сябе служку — быццам гэта сам Сіротка! Некалькі хвілін ад першай асобы ідуць разважанні пра смерць і паслясмерце, і ўсё гэта не без аўтэнтычнага трылернага саўндтрэка. Пазней голас з'яўляецца ў сцэнах падарожжа Мікалая Хрыстафора Радзівіла па свеце, у прыватнасці ў Егіпет. На жаль, рэжысёр Юрый Цімафееў не даціскае сваю задуму. Устаўкі гэтых аўдыягульнявых элементаў заканчваюцца гэтак жа раптоўна, як і з'яўляюцца, і далей ідзе звычайнае дакументальнае кіно з расповедам даследчыкаў пра тое, як Сіротка арганізоўваў тагасветныя рытуалы паводле фараонскіх лякалаў.

АДЦЕННЕ VIII. «ШАХЦЁРЫ»

Цікава абыходзіцца са сваім сюжэтам і рэжысёр Віктар Аслюк. Шахцёрская праца — справа даволі марудная, ды і ўмовы здымак — падземна-паўзмрокавыя — не самыя камфортныя для аператара. Аднак усё вырашаецца досыць элегантна і эстэтычна: рэжысёр хаця і паказвае шахцёрскія будні з іх асаблівасцямі, але ў гэтым фільме галоўная роля ў падземнага змроку. Гульня прыглушанага святла робіць са звычайных калідораў «Беларускалія» нешта фантастычнае: у моманты адсутнасці фокусу на чалавечых фігурах карціна нагадвае ці то экранізацыю трэцяй кнігі Волкава пра канзаскую дзяўчынку Эллі, ці то постапакаліптычна-касмічныя падземныя пейзажы планеты Плюк з фільма «Кін-Дза-Дза». Пры належнай рэкламнай кампаніі гэтай стужкі можна лёгка ўявіць, як на шахцёрскія пасады заступае хваля хіпстараў, якія без вялікіх нагаманняў змаглі б разгледзець у падземным змроку шлях да чарговай духоўна-ачышчальнай практыкі. Але нават без усялякай рэкламы тое, што шахцёры — прадстаўнікі нейкай асобнай магічнай расы, накшталт гномаў, спадзяюся, яны ведаюць і самі: дзесьці глыбока ўнутры, дзе іх уласны свет рэзаніруе з падземным змрокам, і нараджае нешта асаблівае.

АДЦЕННЕ IX. «ЛЕБЕДЗІ»

Неверагодна цяжка паверыць у тое, што гэты фільм дакументальны. У стужцы пра аддзяленне хуткай дапамогі Светлагорска па-іграваму фактурна ўсё: урачы, фельчары, дыспетчары, хворыя, нават аўтамабілі!.. Галіна Адамовіч, па яе словах, наўмысна ўзялася здымаць гэты фільм не ў буйным горадзе, накшталт Мінска, а там, дзе спакайней, менш бюракратыі і больш чалавечага стаўлення. Такі падыход дазволіў ёй здымаць не толькі ў будынку хуткай дапамогі, але і ў машыне, і нават на выкліках. Гэта пазбавіла фільм белых плямаў і зрабіла лінію апавядання роўнай, каб яе рух быў цалкам у руках рэжысёра. Супрацоўніца дыспетчарскай, чые жарты былі вартыя добрай паловы серыяла «Інтэрны», прымала выклікі. Далей камера рухалася за медыкамі да аўтамабіля, дзе пад трывожны гітарны дылэй глядач разам з героямі перамяшчаўся да хворага. У хаце ў большасці былі пажылыя людзі, якія таксама сыпалі грымучыя перлы падчас лячэння. Далей у гульню ўступалі насілкі, якія загружаліся ў машыну: то за штосьці чапляліся, то не пападалі ў пазы, то саслізгвалі з ненадзейных металічных канструкцый. Медыцынскага персаналу для загрузкі не заўсёды хапала — часам даводзілася далучацца родным хворага. Потым — зноў паездка ў аўтамабілі і вяртанне на станцыю. Кожны выпадак багаты на ўнікальныя рысы. На выпадках з алкаголікамі і наркаманамі фонам добра чуецца голас Ільі Чарапко-Самахвалава з гурта «Касіяпея» (дарэчы, у тым самым трывожным гітарным дылэі распазнаецца фрагмент песні з іншага гурта Ільі «Пятля Прыхільнасці»). Паміж выклікамі некаторыя медыкі працягваюць разыгрываць камедыю, а некаторыя пасопваюць на ўтульнай канапе, пакуль дзесьці побач па тэлевізары ідуць мульцікі. З кожнага героя-медыка ліецца дабрыня, цярплівасць і ўнутраная моц, з кожнага героя-хворага — бязмежны давер і ўдзячнасць. І менавіта гэты падыход Галіны Адамовіч — насуперак рэальным абставінам паказаць штосьці поўнае свету і надзеі — набліжае гэты дакументальны фільм да фільма іграваога.

АДЦЕННЕ X. «УНОВІС»

Юнак з выразным тварам малюе ў блакноце геаметрычныя фігуры, пакуль недзе непадалёк разрываюцца бомбы. Юнак устае, ідзе да лесу, ідзе лесам, выходзіць з лесу ў поле, ідзе полем, спыняецца. Працягвае руку ўперад — у паветры матэрыялізуецца вялікі, у два чалавечыя росты, чорны квадрат і кранае руку. З гэтага моцнага іграваога фрагмента пачынаецца дакументальная карціна Яўгена Сяцько паводле сцэнарыя Уладзіміра Мароза, у якой паказана гісторыя Казіміра Севярынавіча Малевіча «віцебскага» перыяду і некалькімі гадамі пазней. Сама па сабе з'ява супрэматызму (і наогул любога авангарда) досыць цікавая, каб за кошт адных толькі фактычных звестак зрабіць цікавае кіно. Але рэжысёр гэтага фільма пайшоў крыху іншым шляхам — і зрабіў гэта не без дапамогі акцёра Канстанціна Конюхава, які выканаў роль Малевіча. Ягоны палымяны позірк і ашалела-натхнёны выраз твару дзейнічаюць гіпнатычна, а памножаныя на чытанне вытрымак з малевіцкіх дэкларацый і маніфестаў зараджаюць глядача творчасцю. У нейкі момант цытаванне заканчваецца, і застаюцца толькі маўклівыя позіркі ў мальберты вучняў, але нават у такіх не надта актыўных абставінах Конюхаву ўсё роўна ўдаецца натхніць — як вучняў на экране, так і гледачоў па іншы ад яго бок. І гэта нават не адзіны тып гульнявых уставак. Другі тып прадстаўляе сабою вуліцы сучаснага Віцебска, на сценах якіх з дапамогай камп'ютарнай графікі вельмі натуральна намаляваныя супрэматычныя карціны… Так з дапамогай пастановачных кадраў і іншай недакументалістыкі гэты фільм выглядвае са свайго жанравага кутка — і яго электрычнага позірку хапае, каб зарадзіць творчай энергіяй кожнага, хто паспрабуе дастукацца ў квадратнае сэрца супрэматызму.

АДЦЕННЕ №… Падкажа жыццё

Дакладна, мы жывём у свеце, дзе гульнявое кіно распаўсюджана больш за дакументалістыку і анімацыю. Але ці перашкаджае гэта дакументальным фільмам і анімацыі займаць тое месца, якога яны заслугоўваюць? Ці знік са свету тэатр, калі з'явіўся кінематограф? Не, таму і дакументалістыцы — жыць і адлюстроўваць жыццё.

Беларускія рэаліі могуць падацца шэрымі, але толькі на першы погляд: нават у шэрасці ёсць свае адценні. І часам яны больш красамоўныя, чым чарговы рамкам з галівудскім прыгажунчыкам ці гісторыя ліхога самаўпраўца ў каляровым адзенні.

Данііл ЛЫСЕНКА

імя ў гісторыі

НЕМЭН: ВЯРТАННЕ ГЕНІЯ

Кнігу-альбом Веры Савінай і Вітаўля Раковіча «Чэслаў Немэн», што адкрыў выдавецкую серыю *Genius Loci* («Геній месца»), прадставілі падчас Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. Прэзентацыя стала першай з імпрэз, што маюць адбыцца сёлета з нагоды 80-годдзя нашага выдатнага земляка, музыканта з сусветным імем. Важна, што кніга стала вынікам шматгадовай сумеснай працы прыватных асоб і прадстаўнікоў мясцовай улады па захаванні памяці пра Чэслава Немэна. Як у Старых Васілішках, на яго малой радзіме, так і ў Беларусі ў цэлым.

Павандраваўшы колькі гадоў таму па ўзбярэжжы Нёмана, нямецкі публіцыст, журналіст Увэ Рада ў сваёй кнізе «Галасы Панямоння», што стала вынікам антрапалагічнага міні-даследавання, поруч з вялікімі гарадамі нёманскага басейна — Гародняй, Калінінградам, Беластокам, Каўнасам — паставіў невялічкую беларускую вёсачку Старыя Васілішкі, што на Шчучыншчыне. Зрэшты, гэтае месца стала ўжо амаль намоленым для ўсіх аматараў выкшталцонага арт-року XX стагоддзя. Тут 80 гадоў таму нарадзіўся Чэслаў Выдрыцкі, якога свет музыкі ведае пад іменем Чэслаў Немэн. І гэта нават не псеўданім. Здаецца, сама рака некалі нашаптала чуйнаму хлопчыку, музыканту-самародку яго геніяльныя мелодыі. А сёння сам Чэслаў стаў тым самым *Genius Loci*, што натхняе на творчасць і прымушае дзейнічаць.

Лёс Чэслава Немэна варты не аднаго рамана: геніяльны хлопчык з беларускай вёскі, які не атрымаў спецыяльнай адукацыі, нават не скончыў сярэднюю школу, дасягнуў такіх вышыняў у творчасці, што стаў, як кажуць, «музыкантам для музыкантаў». Каб яго слухаць, разумець, трэба быць хаця б крыху музычна адукаваным. Пачынаў з простых твораў, адным з першых выкарыстоўваў высокую паэзію польскіх, рускіх класікаў у рок-музыцы... У Польшчы сёння вельмі шануюць талент Чэслава Немэна, яго імя носяць вуліцы, яму стаяць помнікі, праводзяцца фестывалі яго памяці. У нас — пакуль толькі дом-музей у Старых Васілішках, дакументальны фільм «Гэты дзіўны свет» і новы альбом-кніга «Чэслаў Немэн».

Таццяна Бембель, мастацтвазнаўца, сябра апякунскай рады дома-музея Чэслава Немэна ў Старых Васілішках, падчас прэзентацыі выдання падкрэсліла:

— Кнігу можна назваць пэўнага кшталту пропускам у прастору Чэслава Немэна. Людзі, якія прыязджаюць у Старыя Васілішкі, на першы погляд, не бачаць там нічога незвычайнага: вясковыя дамы, палі, касцёл… Кніга ж паглыбляе ў сутнасць феномену Немэна, дае магчымасць скласці ўласны маршрут для знаёмства.

Кожны з раздзелаў раскрывае асобныя старонкі жыцця і творчасці вядомага музыканта: «Дзяцінства», «Касцёл», «Прызнанне», «Музей». Напрыклад, ёсць расповед пра ўнікальны арган, які знаходзіцца ў касцёле святых Пятра і Паўла ў Старых Васілішках. Ён быў створаны ў канцы XVIII стагоддзя, перажыў дзве сусветныя вайны і ўвесь гэты час гучаў. Аднак у 1950-я гады касцёл закрыты (гэта, дарэчы, і стала адной з прычын эміграцыі сям'і Чэслава Немэна ў Польшчу), а арган паступова прыйшоў у занядбаны стан, быў разбураны вандаламі. Работа над яго рэстаўрацыяй доўжылася каля 5 гадоў, і сёння інструмент, які маўчаў паўстагоддзя, зноў загучаў.

Адна з аўтараў выдання, журналіст, кінасцэнарыст, старшыня апякунскай рады дома-музея Чэслава Немэна Вера Савіна распавяла:

— Для нас вялікі гонар дакрануцца да такой асобы, як Чэслаў Немэн. Жаданне выдаць кнігу існавала даўно, але мы нібыта чакалі патрэбнага моманту. І вось справы пачалі складвацца амаль стыхійна. Выданне падтрымалі і прыватныя асобы, і прадстаўнікі Шчучынскага райвыканкама.

Гісторыя сучаснага «неманазнаўства» доўжыцця каля дзесяцігоддзя. У 2009-м, таксама ў юбілейны год, на Беларускім тэлебачанні пра Чэслава Немэна быў створаны дакументальны фільм «Гэты дзіўны свет». Стужка выклікала шырокі грамадскі рэзананс, у Шчучынскі райвыканкам пачалі дасылаць лісты… І аўтары адзначаюць, што тады немагчыма было не стварыць музей. У выніку ён адкрыўся ў старым сямейным доме Выдрыцкіх. Сёння музей наведвае шмат турыстаў з Беларусі і замежжа, ён цалкам самаакупальны і дае прыбытак як установа культуры.

— Чэслаў Немэн выступаў у Мінску ў 1976 годзе, — прыгадвае Вера Савіна. — Той канцэрт я памятаю так яскрава, як нямногія за жыццё. У мяне атрымалася ўзяць у яго інтэрв'ю, але яно, на жаль, у друк не выйшла. Тады да музыканта ставіліся як да здрадніка, маўляў, ён эміграваў з Беларусі, працаваў на карысць чужой культуры. Але фотаздымкі, зробленыя падчас той памятнай размовы, сталі аднымі з першых экспанатаў у музеі.

Дарэчы, як часта здараецца з памятнымі рэчамі нашых амаль сучаснікаў, новыя прадметы ў музей паступаюць і сёння. Рэдкія фотаздымкі, невядомыя запісы ад чыстага сэрца перадаюць аматары творчасці Немэна. Рэчы доўгі час захоўвалі ў сем'ях як памяць пра любімага музыканта.

— Гэта нейкі высокародны рух, які нарадзіўся і развіваецца ў першую чаргу дзякуючы стаўленню да асобы Немэна не толькі як да мастака, але і як да чалавека, — кажа Вера Савіна. — Часта ж бывае, што ў мастацтве маштаб таленту творцы і чалавечыя якасці не супадаюць. Немэн — той рэдкі выпадак, калі супадзенне амаль ідэальнае.

Паводле філасофскай тэорыі пра генія месца, *Genius Loci* мусіць натхняць, нібыта падштурхоўваць чуйных творцаў да адкрыццяў, скіроўваць іх у пошуках. І па ўсім відаць, што Чэслаў Немэн выдатна спраўляецца з гэтай роляй. Так, Віталь Раковіч, фотамастак, які працаваў над кнігай, расказаў:

— Вельмі цікавы факт: каля двух гадоў таму ў Старых Васілішках наша каманда паказвала адзін з першых варыянтаў альбома пра Чэслава Немэна. І літаральна ў той жа дзень на гарышчы старой хаты мы знайшлі сшыткі, ноты, малюнкі, фотаздымкі музыканта. Проста выдатныя падарункі і адкрыцці для дома-музея! Думаю, гэта пацвярджае, што самому Чэславу Немэну наша праца вельмі падабаецца.

Выхад кнігі-альбома «Чэслаў Немэн» — не кропка, а пачатак новага этапу ў рабоце па ўшанаванні памяці нашага выдатнага земляка. Сёлета плануецца многа юбілейных імпрэз. Так, заўтра, у дзень нараджэння музыканта, Польскі інстытут ладзіць у Мінску паказ дакументальнага фільма пра жыццё і творчасць Чэслава Немэна. Напрыканцы чэрвеня, у дзень святых Пятра і Паўла, у Старых Васілішках адбудзецца канцэрт з арганам, падчас якога прагучыць музыка нашага выдатнага земляка. На працягу года будуць арганізоўвацца вандроўкі са сталіцы на малую радзіму творцы.

Дарэчы, родныя мясціны славутага музыканта, яго дом-музей і маляўнічыя пейзажы на ўзбярэжжы Нёмана можна выправіцца вывучаць, разглядаць і самастойна. Варта распачаць вандроўку, а куды рухацца — сам Немэн падкажа.

Марына ВЕСЯЛУХА



святочнае

Джаз. Рамантыка

Рэальна закаханыя не глядзяць на дату, і свята для іх можа доўжыцца бестэрмінова. Відаць, пра гэта нагадае амерыканская джазавая спявачка Ванеса Рубін, якая ўпершыню ў Мінску выступіць са святочнай праграмай да Дня закаханых. Але 15 лютага на сцэну Белдзяржфілармоніі разам з артысткай выйдзе яе трыа. Пра голас крышталёвай чысціні і шырокі спектр эмоцый, якія салістка здольная перадаваць голасам, можна шмат дзе прачытаць. І застаецца паверыць.

Ванеса Рубін паходзіць з Кліўленда, а ў яе сям'і перапляліся розныя культуры, ёсць нават трынідацка-карыбскія карані. Спяваць яна пачала рана, і кар'ера склалася вельмі плённа, у тым ліку выпала супрацоўнічаць з выдатнымі музыкантамі. Мо сапраўды не так шмат спевакоў, якія здольныя праз песню распавесці гісторыю жыцця. Застаецца праверыць…

аўтарскае

Шоу. Шалкевіч

Віктару Шалкевічу — 60 гадоў. Правяраць не трэба, але варта наведаць яго сольны канцэрт, які пройдзе 16 лютага ў Палацы культуры прафсаюзаў. Шалкевіч не проста святкуе, ён працуе, і вынікам працы — песні з новага альбома, што бард мяркуе прадставіць падчас канцэрта. Плюс лепшае, любімае і толькі для тых, хто ловіць момант паслухаць жыццёвыя, трапныя, з гумарам і аптымізмам песні Шалкевіча.

Акрамя таго, важны сам факт жывых зносінаў артыста з залай, а таксама імправізацый ад творцы, якога лічаць адным з самых яркіх шоуменаў Беларусі. Яго песні — гэта драбніцы жыццёвых сітуацый, назіранняў за людзьмі, мікрасюжэты, у якіх адбіваецца наша штодзённасць. Навошта яе слухаць? Ды таму, што ў ёй прыхаванае і натхненне, і вера ў чалавека, без якой немагчыма рухацца і нешта рабіць. Вось як гэта атрымліваецца ў Шалкевіча…

роднае

Мова. Натхненне

Міжнародны дзень роднай мовы — з роднымі песнямі. Наведнікі кавярні «Грай» 21 лютага змогуць далучыцца да музычнага святкавання. Слухаць (словы літаратараў) па-беларуску, падпяваць (музыкам) па-беларуску, гаварыць (з тымі, хто так жа адчувае) па-беларуску. Сярод удзельнікаў канцэрта — *AKUTE, UZARI*, рэпер *ANGST*, Усевалад Сцебурака, Наста Кудасава, Марыя Мартысевіч, Стась Карпаў. Арганізатары прадумалі інтэрактыўныя праграмы, напрыклад, шоу «Самшазам» (накшталт «Угадай мелодыю»), пляцоўкі настольных гульняў, дзіцячых забаў, кірмаш.

У гэты дзень каманда *SAY.BY* прэзентуе новую версію мабільнай праграмы для размоў па-беларуску — гэта карысна для тых, хто працуе ў сферы абслугоўвання і хоча гаварыць па-беларуску ў штодзённым жыцці. Пратэсціраваць праграму госці змогуць на месцы, узяўшы ўдзел у квэстах з яе выкарыстаннем. Пакажам, што беларуская мова не толькі жыве і развіваецца, але і натхняе на добрыя справы?..

Падрыхтавала Марыя АСІПЕНКА

Скарбонка Спадчыны

Фота Альфрэда Мікуса.

Каб жылі ў ладзе і згодзе

Лялькі — на шчасце, дабрабыт і каханне

У нашы дні лялькі часцей за ўсё асацыююцца з дзіцячымі гульнямі і, паводле меркаванняў большасці, з самага маленства мусяць прывучаць дзяўчынку клапаціцца пра будучых дзяцей і быць дбайнай гаспадыняй. Але калі зірнуць на ляльку ў кантэксце традыцыйнай культуры, то яе значэнне стане намнога шырэйшым па спектры ўплываў на дабрабыт, лад у сям'і і нават… выкананне самых запаветных жаданняў. Яна набывае магічны, рытуальны сэнс, служыць не толькі забаўкай для дзяцей, але і пэўнага кшталту гарантам падтрымання трываласці сямейных стасункаў. Прыгадайце хаця б фільмы жахаў, дзе часам у сюжэт уплятаюць згадкі старажытнай магіі вуду, калі атрапаморфныя лялькі, зробленыя з воску, валасоў, становяцца мініцюрнай копіяй чалавека і здольныя ўплываць на яго лёс.

Натуральна, беларусы абрадава-абярэгавыя лялькі рабілі не з мэтай камусьці нашкодзіць, хутчэй наадварот: каб супакоіць дзіця, садзейнічаць выкананню жадання, гарантаваць згоду паміж мужам і жонкай, садзейнічаць працавітасці гаспадыні. Менавіта з гэтай мэтай маладым часта дарылі так званых лялек-неразлучніц — дзве тэкстыльныя фігуркі, аб'яднаныя агульнай «рукой», каб і маладыя ўсё жыццё крочылі разам. Нездарма ж, калі жаніх і нявеста ідуць пад вянец, іх рукі звязваюць ручніком.

Сёння такія лялькі дораць на вяселле, улазіны, а майстар-класы па іх вырабе становяцца выдатнай моднай фішкай свята закаханых. Напрыклад, усе ахвотныя маглі навучыцца іх рабіць падчас свята, што не так даўно прайшло ў Беларусім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту. Вырабляюцца «неразлучнікі» з кавалачкаў тканіны, якія скручваюцца адмысловым чынам і перавязваюцца ніткамі. Часам у якасці агульнай «рукі» выкарыстоўваецца палачка. Дарэчы, традыцыйна асіну і алешыну браць было нельга, бо гэтыя дрэвы паводле павер'яў звязаныя з цёмнымі сіламі. Такія лялькі пасля вяселля беражліва захоўваліся на покуці, а са з'яўленнем у сям'і дзетак на руку «неразлучнікам» мацаваліся дзеткі — таксама зробленыя з тканіны. Дарэчы, сучасная традыцыя саджаць на капот вясельнай машыны ляльку таксама родам са старажытнасці. У старадаўнія часы пад дугой вясельнага воза ехалі лялькі-неразлучнікі, засцерагаючы безабаронных маладых ад сурокаў.

Адметна, што традыцыйныя лялькі вельмі складана дыферэнцыраваць паводле нацыянальнай прыналежнасці, вызначыць дакладнае месца іх паходжання. Ды і ў межах Беларусі арэал распаўсюджання кожнага з відаў абрадава-абярэгавых лялек, бадай, прасачыць немагчыма. Яно і зразумела: такія лялькі вельмі лёгка зрабіць, дзеці могуць з імі гуляць, ды і ў абыходжанні яны вельмі простыя, бяспечныя (бо робяцца ў асноўным з тканіны). Больш за тое, «жыццё» такіх цацак зазвычай нядоўгае: танны матэрыял, магчымаць узнавіць у любы момант робяць цацку рэччу, якую нястрашна згубіць, парваць ды і проста выкінуць. Тым не менш кожны з відаў абярэгавых лялек мае глыбокае сімвалічнае значэнне, якое можна пабачыць ужо ў іх назвах.

Гэта, напрыклад, лялька-пажадальніца, анёл на пальчык, зайчык на пальчык, лялька на шчасце ці лялька з цікавай назвай трохкольца. У аснове трохкольцы — грэцкі арэх і сем зярнятак грэчкі. Зярняткі закладвалі ўнутр шалупіння грэцкага арэха, таму, калі такую ляльку патрэсці, можна пачуць ціхі і прыемны гук. Грэчка сімвалізавала здароўе, а сама лялька супакойвала гучаннем, таму яе часта давалі маленькім дзеткам і хворым, каб яны хутчэй засыналі. Майстрыхі кажуць, што менавіта грэчка дае такі заспакаяльны эфект. Калі паспрабаваць выкарыстоўваць гарох, іншыя крупы, гук атрымаецца званчэйшы і не будзе мець такога ўздзеяння, як ад грэчкі. Больш за тое, трохкольцу можна даваць дзеткам, у якіх рэжуцца зубкі.

Ляльку на шчасце таксама вельмі любяць дзеці. Яна зазвычай маленькая і мае доўгую касу, яе зручна насіць у кішэні. Каса ў лялькі доўгая, бо сімвалізуе шчасце і даўжыню жыцця чалавека. Чым каса даўжэйшая — тым лепш. А вось ляльку-пажадальніцу можна назваць таемнай, яе нашы продкі хавалі, каб ніхто не ведаў, што яна ўвогуле існуе. Яе ўпрыгожвалі гузікамі, пацеркамі: прышываючы кожны з іх, загадвалі жаданне і верылі, што яны абавязкова здзейсняцца дзякуючы магічнай сіле. Калі ж лялька цалкам была пакрытая ўпрыгожваннямі, то рабілі новую.

Марына ВЕСЯЛУХА

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Ларыса Іванаўна ЦІМОШЫК

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 292-20-51
намеснік галоўнага рэдактара — 292-43-03
адказны сакратар — 292-20-51
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 292-56-53
аддзел прозы і паэзіі — 292-56-53
аддзел мастацтва — 292-20-51
бухгалтэрыя — 287-18-14

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Нумар падпісаны ў друк
14.02.2019 у 11.00

Ум. друк. арк. 3,72

Наклад — 1182

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013

Заказ — 543

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.